Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 311 (4217)
Серада, 18 лістапада
1931 г.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Па-бальшавіцку рэалізаваць баявую праграму (1-я старон.).
М. ГАНЧАРЫК.—Праблемы навукова-дасьледчай работы ў галіне біалёгічных дысцыплін (2-я стар.). МІКУЦКІ.—Абязьлічанае сельспажыў таварыства (3-я стар.).
ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ (1-я стар.).
Выйсьці ў першыя калёны барацьбітоў за збожжа (1-я стар.).
Фарсаваць скончэньне пабудовы сьвінарнікаў і абораў (1-я стар.).
Справа партыйнай асьветы павінна займаць увесь час неаслабную ўвагу кожнай ячэйкі КП(б)Б (2-я стар.).
Ніводнага дзіцяці па-за школай (3-я стар.).
Ажыцьцявіць 6 умоў тав. Сталіна на лесараспрацоўках (3-я стар.).
КІТАЙ. Японія ня хоча гаварыць аб эвакуацыі Манчжурыі (4-я стар).
Кампартыя Польшчы заклікае працоўных да барацьбы супроць японскага імпэрыялізму, за абарону СССР (4-я стар.).
ПА СССР І БССР (4-я стар.).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

12—16 лістапада адбыўся аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Пленум разгледзеў наступныя пытаньні: 1. Аб выкананьні дырэктыў партыі па чыгуначным і водным транспарце; 2. Аб сацыялістычным разьвіцьці жывёлагадоўлі; 3. Аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў; 4 Аб ходзе заготовак; 5. Інфармацыю аб перавыбарах парторганаў.

Рэзалюцыі па ўсіх гэтых пытаньнях аднагалосна прыняты пленумам і будуць апублікаваны ў бліжэйшы час.

Пленум увёў у склад ЦК і выбраў членамі бюро ЦК КП(б)Б т. т. МАТСОНА (ПП АДПУ) і Ўбарэвіча (камандуючага войскамі БВА).

Пленум увёў у склад ЦК КП(б)Б т. т. ГАРЫНА, ДУКЕЛЬСКАГА і ШАПІРА.

Рэдактарам органу ЦК КП(б)Б газэты „Зьвязда" зацьверджан тав. ГАРЫН.

„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА—ПРЫВАТНІКУ"

Выйсьці ў першыя калёны барацьбітоў за збожжа!

Выкананьне абавязкаў перад дзяржавай—асноўная, баявая задача

Па-бальшавіцку рэалізаваць баявую праграму

Пазаўчора скончыў свае работы чарговы аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б. У парадку дня пленуму стаялі пытаньні, якія на даным этапе зьяўляюцца вузлавымі і рашаючымі.

Пленум у сваіх пастановах даў глыбокі, усебаковы аналіз і практычнае вырашэньне іх, накіраванае на поўную рэалізацыю пастаноў КАСТРЫЧНІЦКАГА ПЛЕНУМУ ЦК УсеКП(б). Лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваіх пастановах даў усёй партыйнай арганізацыі разгорнутую праграму, якая ўсім сваім зьместам накіравана на павышэньне тэмпаў і якасьці работы на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва.

ЧЫГУНАЧНЫ ТРАНСПАРТ БССР пры наяўнасьці некаторых палепшэньняў усё яшчэ працуе нездавальняюча. Тэмпы работы чыгунак і асноўных вузлоў не забясьпечваюць выкананьня пляну перавозак, недапушчальна адстаюць ад агульных тэмпаў рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі краіны. Недавычай дрэнна праведзена падрыхтоўка ДА АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК.

Гэта рэзультат таго, што партыйныя арганізацыі не разьвілі бальшавіцкага змаганьня за рэалізацыю тых дырэктыў, якія дала партыя па рэканструкцыі і рацыяналізацыі транспарту. Партыйныя арганізацыі на транспарце яшчэ не завяршылі перабудовы сваёй работы, не перанесьлі цэнтру цяжару яе ў цэх, групу, брыгаду, на паравоз.

Задача партыйных ячэек і ў першую чаргу транспартных давесьці пастановы лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б да кожнага партыйца і беспартыйнага рабочага-чыгуначніка, разьвіць вакол іх сапраўды бальшавіцкае змаганьне за аздараўленьне работы транспарту. Бліжэйшая дэкада павінна ва што-б там ні стала даць пералом у рабоце і ў першую чаргу на вузлавых рашаючых участках чыгункі. Такімі вузлавымі вучасткамі зьяўляюцца на сёньняшні дзень ПАРАВОЗНЫ ПАРК, СЛУЖБА ЭКСПЛЁАТАЦЫІ І ВАГОЧНЫ ПАРК. Падцягнуць гэтыя вучасткі работы—гэта значыць канчатковa ЛІКВІДАВАЦЬ ЗРЫВЫ СПАРАНАЙ ЯЗДЫ, ЗЬНІШЧЫЦЬ АБЯЗЬЛІЧКУ, як у паравозным, так і ў вагонным парках, даць поўную нагрузку паравозу, павялічыць продукцыйна-карысную работу паравоза на адну гадзіну ў суткі, мабілізаваць усе рэзервы для пашырэньня вагоннага парку, дабіцца ЯКАСЬЦІ рамонту паравозаў і вагонаў, забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне загаду тав. Андрэева аб маршрутызацыі і спэцыялізацыі цягнікоў. ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК, УВЯДЗЕНЬНЕ ПРАГРЭСЫЎНА-ПРЭМІЯЛЬНАЙ АПЛАТЫ ПРАЦЫ—магутныя вагары ў палепшэньні работы чыгункі. Транспартныя партарганізацыі дабіцца перамог толькі на аснове НЯЎХІЛЬНАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ШАСЬЦІ ЎМОЎ ТАВ. СТАЛІНА І ЗАГАДУ ТАВ. АНДРЭЕВА, толькі на аснове бязьлітаснага змаганьня супроць апартуністаў усіх колераў, супроць бюракратызму і рутынэрства, якія ня вытручаны яшчэ з кіруючых апаратаў чыгункі.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту дабілася вялікіх посьпехаў у практычнай рэалізацыі дырэктыў XVI зьезду УсеКП(б) аб СПЭЦЫЯЛІЗАЦЫІ сельскай гаспадаркі т. зв. спажывецкіх раёнаў, да якіх адносіцца і Беларусь. Няўхільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі КП(б)Б з посьпехам пераўтварае БССР з раёну спажываючага ў раён буйнэ-разьвітай сацыялістычнай ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ І ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР. Ужо зараз БССР зьяўляецца адным з важных жывёлагадоўчых раёнаў Савецкага Саюзу.

Сацыялістычны сэктар ужо ў бягучым годзе здаў дзяржаве 21.300 цэнтнэраў сьвінога мяса і 670.660 цэнтн. малака.

Гэтыя посьпехі зьяўляюцца толькі пачаткам у вырашэньні ўсёй праблемы жывёлагадоўлі. Першараднай задачай усёй КП(б)Б зьяўляецца фарсаваць работу па рэалізацыі тэй грандыёзнай праграмы, якая вызначана партыяй у разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі БССР. Раённыя партарганізацыі і парт'ячэйкі павінны мабілізаваць усе сілы на выкананьне пляну ўкамплектаваньня стада жывёлагадоўчых саўгасаў, МТФ і СТФ, захоўваць і арганізаваць умелую гадоўлю маладняка, весьці жорсткае змаганьне са стратамі ў жывёлагадоўлі (вялікі адыход), пашыраць кармовую базу і з посьпехам скончыць будаўніцтва скотных двароў і сьвінарнікаў.

Барацьба за ЯКАСЬЦЬ — першарадная задача, якая стаіць перад кожнай партыйнай арганізацыяй, кожным калгасам і саўгасам. Высокай таварнасьці і якасьці можна дасягнуць толькі на аснове ўвядзеньня ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ І ЛІКВІДАЦЫІ АБЯЗЬЛІЧКІ ва ўсіх жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах, ва ўсіх калгасных таварных фэрмах. Больш адказнасьці ў ажыцьцяўленьні кожнага мерапрыемства, вышэй тэмпы і якасьць партыйнай работы і кіраўніцтва!

Цэнтральнае месца ў рабоце пленуму займала пытаньне АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА УМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ. КП(б)Б у жорсткім змаганьні на два фронты, супроць правых і «левых» апартуністаў, помячы ў адкрытым бай супраціўленьне кулацтва, дабілася гігантскіх посьпехаў у калгасным будаўніцтве. Зараз 50 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак БССР аб'яднаны ў калгасы, 9 раёнаў у асноўным ужо завяршылі суцэльную калектывізацыю. Калгасьнік стаў цэнтральнай фігурай зямляробства, асноўным вытворцай сельска-гаспадарчай прадукцыі і сапраўды моцнай апорай савецкай улады на вёсцы. Мы атрымалі ў барацьбе з кулацтвам рашаючыя перамогі. Пад сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі падведзена магутная тэхнічная база. 30 МТС працуюць на калгасных палёх Беларусі. На аснове будаўніцтва буйных саўгасаў і калгасаў здабыты вялікія посьпехі ў справе спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі.

Гэтыя посьпехі ў ажыцьцяўленьні пёзунгу суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва як клясы стварылі НОВУЮ абстаноўку. Цэнтральнай задачай у гэтай новай абстаноўцы зьяўляецца АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ УМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ, якое заключае ў сабе цэлую суму мерапрыемстваў, накіраваных на павышэньне калгаснай вытворчасьці. Практычная рэалізацыя гэтай задачы—правядзеньне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў — вызначае сабою і посьпехі далейшага разгортваньня калгаснага будаўніцтва. «Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу — ёсьць барацьба за далейшую калектывізацыю, за новыя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі» (ГЕЙ).

Аднак, «ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ЯШЧЭ НЕ ПЕРАКЛЮЧЫЛАСЯ НА ВЫРАШЭНЬНЕ ПА-БАЯВОМУ АСНОЎНАЙ ЗАДАЧЫ, ЯКАЯ СТАІЦЬ ПЕРАД ПАРТ-АРГАНІЗАЦЫЯЙ У КАЛГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ». Такую ацэнку дало бюро Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б у сваёй пастанове ад 10 лістапада бягучага году рабоце арганізацыі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Пранізваючы ўсю сваю работу бальшавіцкай самакрытыкай, пленум ЦК перагледзеў пастанову ліпеньскага пленуму ў тэй частцы, якая ставіла перад партыйнай арганізацыяй задачу дабіцца ўвесну 1932 году ахопу калектывізацыяй 75 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак і завяршэньня суцэльнай калектывізацыі да канца 1932 году. У сваёй пастанове пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьліў, што толькі на аснове шырока-разгорнутай работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў будзе з посьпехам вырашана задача завяршэньня суцэльнай калектывізацыі. Той, хто падмяняе гэту асноўную задачу пагоняй за дутымі процантамі калектывізацыі, ня толькі не разумее асноўных задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на даным этапе, а ідзе супроць генэральнай лініі партыі.

Пастанова пленуму аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў ставіць перад партыйнымі арганізацыямі пытаньні арганізацыі працы на аснове ўвядзеньня ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ, правільнага РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ДАХОДАЎ па прынцыпах колькасьці і якасьці затрачанай працы, пытаньні ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ, ПАВЫШЭНЬНЯ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ, РАЗЬВІЦЬЦЯ ВЫТВОРЧАСЬЦІ — як цэнтральную задачу дня. Правядзеньне ў жыцьцё пастановы пленуму забясьпечвае ПОЎНУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ РАШЭНЬНЯ ЦК УсеКП(б) АД 2-га ЖНІЎНЯ.

Па-бальшавіцку ажыцьцявіць задачу арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў можна толькі на аснове непрымірымага змаганьня супроць правых і «левых» апартуністаў. Правыя апартуністы, агенты кулака, якія недаацэньваюць элемэнтаў класавага змаганьня ў калгасах, якія патураюць буржуазным, кулацкім, рэацкім тэндэнцыям, якія справу калектывізацыі прадстаўляюць самацёку, зьяўляюцца галоўнай небясьпекай на даным этапе. Кулак, якому не ўдалося ўтрымаць бяднякасерадняцкія масы ад уступленьня ў калгасы, зараз імкнецца пралезьці ў сельска-гаспадарчую арцель і разваліць калгас З СЯРЭДЗІНЫ.

Канцэнтруючы агонь бальшавіцкага змаганьня супроць правых апартуністаў, партыйныя арганізацыі ні на хвіліну не павінны аслабляць свайго змаганьня і супроць «левакоў», якія недаацэнкай арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, пагоняй за голымі лічбамі калектывізацыі падрываюць далейшае разьвіцьцё калгаснага руху. «Лявацкія» элемэнты імкнуцца ахапіць увесь калгасны рух, узводзяць паклёпы на сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі. Даць самы бязьлітасны бой апартуністам усіх колераў, якія ў апошні час імкнуцца зноў падняць сваю галаву, рашуча выкараняць апартуністычную практыку і «лявацкія» перагібы! Гэта асноўная ўмова пасьпяховага змаганьня партыйных арганізацый за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за разьвіцьцё калгаснай вытворчасьці.

Поўнае выкананьне пляну загатовак бягучага году зьяўляецца важнейшай зброяй арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Арганізацыі КП(б)Б дабіліся выкананьня пляну адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам СССР. Ліквідавана павінен быць рашаючым у выкананьні пляну загатовак як па ЗБОЖЖЫ, так і па ІЛЬНАВАЛАКНЕ.

Гэтага партарганізацыі змогуць дабіцца разгортваньнем масавай папітычнай работы сярод калгасьнікаў і адна-асобнікаў—бедняковай і серадняковай, узмацненьнем націску на кулацка-заможныя элемэнты.

Пленум Цэнтральнага Камітэту ўхваліў пастановы бюро і сакратарыяту ЦК аб тэрмінах ПЕРАВЫБАРАЎ КІРУЮЧЫХ ПАРТОРГАНАЎ, а таксама дырэктыўны ліст усім партыйным арганізацыям. Справаздачна - перавыбарчая кампанія парторганаў у вясковых парт-арганізацыях павінна мабілізаваць усю партыйную масу на ўзмоцненае змаганьне за рэалізацыю асноўнай задачы—арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Гэта зьяўляецца асноўным крытэрыем у ацэнцы работы кожнага сельпарткому, кожнай калгаснай ячэйкі КП(б)Б.

Асноўны вымяральнік дзейнасьці вытворчых партарганізацый — становішча работы ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ШАСЬЦІ ЎМОЎ ТАВ. СТАЛІНА. Вопыт перадавых прадпрыемстваў, вопыт раду партыйных арганізацый Данбасу паказаў, што там, дзе па-бальшавіцку рэалізаваны Сталінскія ўказаньні, там крывая выкананьня вытворчых праграм пашла крута ўгару.

Работа тэй вясковай ячэйкі, якая не пераключылася на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, работа тэй вытворчай ячэйкі, якая не змагалася за поўнае правядзеньне ў жыцьцё шасьці ўмоў Сталіна, прызнана здавальняючай быць ня можа.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна на вышэйшую ступень узьняць бальшавіцкае змаганьне партыйных арганізацый за ажыцьцяўленьне ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ. Ні на хвіліну не аслабляць, а, наадварот, яшчэ больш узмацняць жорсткае змаганьне супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, які прад стаўляе галоўную небясьпеку, супроць ухілу ў бок контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму усіх колераў. Яшчэ больш шырока разгарнуць работу сярод нацменшасьцяй, павысіць партыйнае кіраўніцтва нацыянальна-культурным будаўніцтвам—такая задача партыйных арганізацый.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія кіруючых парторганаў у нізовых і сярэдніх зьвеньнях павінна прайсьці пад знакам павышэньня ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі. Узьнімаючы ідэйны ўзровень партыйных мас, узмацніць іх мабілізацыю на змаганьне з апартуністамі за ўсіх яго праяўленьняў як у тэорыі, так і на практыцы.

Уся работа па правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінна праходзіць, як балевал мабілізацыя мас на выкананьне пастановаў лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. Баявая праграма, якая дана пленумам, павінна быць рэалізавана па-бальшавіцку.

Бягомльшчына не рэалізуе па-баявому пастановы ЦК

БЯГОМЛЬ.—Бягомльскі раён зьяўляецца адным з тых раёнаў, дзейнасьць якіх самым адмоўным чынам ахарактарызавана ў пастанове ЦК КП(б)Б аб загатоўках ад 25-га кастрычніка. Парткіраўніцтва раёну не арганізавала бальшавіцкай барацьбы за здачу збожжа, бульбы, ільну, і не дала рашучага адпору спажывецкім і рвацкім настроям і гутаркам аб нерэальнасьці пляну.

Кулацкія спажывецкія і рвацкія настроі ў радзе калгасаў на толькі не сустракалі рашучага, руйнуючага адпору, але часта падтрымліваліся паасобнымі кіраўнікамі калгасаў і арганізацый. У Бярозкаўскім і Вітуніцкім сельсаветах разьмеркавалі ўраджай па спажывецкім прынцыпе. Некаторыя аграномы з райкалгасаюзу далі дырэктывы, каб калгасы забясьпечвалі ў першую чаргу сябе, а калі што застанецца, аддаць дзяржаве. Каморнік з РКС «вылічыў» і даў адпаведную паперку аднаму з калгасаў, што... дзяржава яму павінна даваць яшчэ 100 пуд.

На пасяджэньні 1-га лістапада бюро райкому ўсебакова абгаварыла пытаньне аб ходзе загатовак па раёне. Бюро прызнала, што дырэктывы аб спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак злачынна ігнаруюцца паасобнымі сельсаветамі, што пізьвіцца арганізацыі не разгарнулі масавай работы вакол здачы збожжа ў першую чаргу.

Бюро райкому абвясьціла вымову сакратаром парт'ячэек Малашчонку, Карніцкаму, Лукашэвічу. Сакратар Іканскай парт'ячэйкі Няхай і старшыня сельсавету Пісоўскі зьняты з работы з абвяшчэньнем суровай вымовы. Старшыня Дамтарыцкага сельсавету Кульба і ўпаўнаважаны Красковіч выключаны з партыі і зьняты з работы.

Аднак бюро райкому, прыняўшы рэпрэсыўныя меры ў адносінах зрыўшчыкаў загатовак, не забясьпечыла яшчэ баявой работы па загатоўках, не мабілізавала вайсковы актыў на выкананьне пляну. На 8-га лістапада план збожжазагатовак выкананы толькі на 54 проц. Кулак аказвае шалёнае супраціўленьне загатоўкам, прыдумвае розныя манэўры, каб упікнуць здачы цьвёрдых заданьняў. Кулакі Мсьціцкага сельсавету ноччу абмалацілі збожжа і вывезьлі ў суседнюю вёску да знаёмых. Заможнік Аўтушка сустрэў па дарозе калгасную фурманку, якая везла збожжа на станцыю, зьняў з яе колы, заявіўшы: «Гэта мае колы, вы іх у мяне абагулілі».

Раённыя арганізацыі не прынялі энэргічных мер, каб згуртаваць масы калгаснага і бяднацка-серадняцкага сялянства на руйнуючы адпор кулаку і яго агентуры.

Зараз райком КП(б)Б абвясьціў 4-хдзеньнік штурму, які павінен даць рашаючы пералом у загатоўках.

Н. КАБАКОЎ.

Прыклад перадавых не падхоплен усімі сельсаветамі

КРУПКІ. Рад сельсаветаў раёну — Крупскі, Выдрыцкі, Слабодзкі, Сакалавіцкі, Абцюгскі — дабіўся ў дні Кастрычніцкіх сьвят рашучага пералому ў збожжазагатоўках і набліжаецца да поўнага выкананьня пляну і скончэньня спагнаньня цьвёрдых заданьняў.

Аднак агульнае выкананьне пляну па раёне не гарантуе ажыцьцяўленьня заданьня ў тэрмін. На 10-га лістапада гадавы план выкананы на 52,5 проц. Асабліва адстае калгасны сэктар, які здаў толькі 37,8 проц.. Такі нізкавы процант здачы збожжа гаворыць аб тым, што ў радзе калгасаў раёнаў дагэтуль ня зжыты кулацка-спажывецкія тэндэнцыі, якія распальваюцца класава-варожымі элемэнтамі.

Ёсьць сельсаветы, як, напрыклад, Жабарыцкі, Нацкі, Траяноўскі, дзе, з прычыны апартуністычнага патураньня кулаку, здача цьвёрдых заданьняў ад 12 да 25 проц.

Прыклад перадавых сельсаветаў Крупскага раёну наглядна даказвае поўную рэальнасьць пляну. Уся справа — у разгортваньні масава-палітычнай работы вакол загатовак.

Вытруціць да канца спажывецка-месьніцкія тэндэнцыі

КОЙДАНАВА.—У сярэдзіне кастрычніка інспэкцыя сацыялістычнага зямляробства Койданаўскага раёну дала інструкцыі ўсім саўгасам і калгасам Койданаўшчыны аб тым, што ў першую чаргу неабходна стварыць кармавыя і розныя іншыя фонды.

Шкодная апартуністычная інструкцыя дагэтуль яшчэ не скасавана. Старшыня РВК тав. Гравіт на пасяджэньні бюро райкому абараняў яе, гаворачы, што яна датычыць.... толькі таварных фэрм.

Інструкцыя аб стварэньні фондаў спрыяла разьвіцьцю кулацка-спажывецкіх тэндэнцый у калгасах і нанесла шмат шкоды выкананьню пляну збожжазагатовак на Койданаўшчыне.

Прасушка збожжа на элеватары станцыі Канеўская (Паўночны Каўказ)

Дагэтуль ёсьць факты, калі калгасы амаль у тры разы вымяншаюць норму ўраджаю — паказваючы ўраджай з аднаго гэкт. па 30 і 40 пуд. аўса і ячменю, замест 70-100, бульбы 200-400 пуд. замест 700-1200. Ёсьць выпадкі вызначэньня кармавога балянсу па падвойных нормах і нават часам на выбракаваную жывёлу.

У калгасе імя Тэльмана плошча пасеваў сьвядома зьменшана, кармавы балянс раздуты. Такія-ж зьявішчы—у калгасах «Расьсьвет» і «Беларусь». У калгасе «Новы будаўнік» так разьмеркавалі ўраджай, што па іх падліках выходзіць, быццам, дзяржаве нічога даць нельга. Старшы інструктар Казлоў аўтарытэтна дазволіў праўленьню калгасу патрабаваць павялічэньня кармавога балянсу на 12.000 цэнт. У калгасе «Чырвоны пагранічнік» знаходзяцца былы польскі паліцэйскі, гандляр Басарэўскі, які эксплёатаваў наёмную сілу, Каладзінскі, які меў 36 дзесяцін, займаўся кантрабандай, да ўступленьня ў калгас гандляваў, у свой час лічыўся дэзэртырам з Чырвонай арміі, заможнікі Быстрымовічы і г. д.

У Калгасе «Петраславічы» доўгі час пасаду старшыні праўленьня займаў былі афіцэр. З 28 членаў калгасу,—12 заможнікаў, якія атрымалі цьвёрдыя заданьні і г. д.

Фарсаваць скончэньне пабудовы сьвінарнікаў і абораў

Раўняцца па саўгасе „Ўваравічы", які па-баявому рыхтуецца да зімоўкі

Буйная рагатая жывёла забясьпечана памяшканьнямі

УВАРАВІЧЫ. Малочна-жывёлагадоўчы саўгас «Ўваравічы» налічвае 400 штук жывёлы. Дзякуючы мабілізацыі саўгаснай масы на барацьбу з прарывамі, зжыты леташнія безадказныя адносіны раду работнікаў да справы, ліквідаваны сур'ёзнейшыя недахопы. У параўнаньні з мінулым годам саўгас значна лепш падрыхтаваны сустракае сёлетнюю зіму. Пабудаваны дзьве новыя сьветлыя аборы для буйной рагатай жывёлы. У цёплых памяшканьнях размешчаны цяляты.

Праўда, яшчэ ёсьць недахопы. Няма, напрыклад, памяшканьня для маленькіх цялят, бо Белсельбуд запаздывае пабудову новых цялятнікаў. Неабходна скончэньне гэтай справы фарсаваць.

Вялікім дасягненьнем трэба лічыць пабудову двух 8-кватэрных дамоў для рабочых. У выніку пераходу на зьдзельшчыну і ліквідацыі абязьлічкі, значна палепшыўся догляд жывёлы. Адыход даведзен да нуля. Удой павялічыўся на 35 проц.

Зараз перад саўгасам стаіць задача — забясьпечыць жывёлу на ўвесь стойлавы пэрыяд кармамі, мабілізуючы ўсе свае ўнутраныя рэсурсы.

М. Гавізінскі.

Увага скончэньню будаўніцтва

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. Малады саўгас «Салецк» (арганізаваны ўвесну г. г.), дзякуючы ўжываньню сапраўды сацыялістычных мэтадаў працы, дабіўся значных вынікаў у галіне будаўніцтва. Ужо заканчваецца пабудова 6-ці сьвінарнікаў. Тры сьвінарнікі поўнасьцю гатовы.

Усяго саўгас павінен быць укамплектаваны 500-600 сьвінаматкамі. Пастаўлена каля 400 сьвінаматак. Дзякуючы адданым адносінам абслугоўваючага пэрсаналу да справы, удалося стварыць больш-менш спрыяючыя ўмовы для жывёлы. Папярэджаны адыход сьвіней.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што яшчэ ёсьць рад значных хібаў. Вельмі слаба пастаўлена работа па зоавэтмінімуме. Масавай работы вакол гэтай справы не вядзецца.

Рабочыя, мясцовыя арганізацыі і адміністрацыя павінны ўсю сваю ўвагу аддаць ліквідацыі недахопаў і фарсаваньню скончэньня будаўніцтва сьвінарнікаў.

Няма куды ставіць сьвіней

ЧЭРЫКАЎ. Сьвінагадоўчы саўгас «Чырвоны Кастрычнік» зусім нездавальняюча рыхтуецца да зімы. На будаўніцтве—танебны прарыў. З пачатых будаўніцтвам 8-мі сьвінарнікаў яшчэ ні адзін ня скончан. У выніку—няма куды ставіць сьвіней.

План камплектаваньня фактычна сарваны. Замест 1.200 сьвіней пакуль што пастаўлена толькі 152. З прычыны дрэннага догляду і антысанітарнага становішча загінула частка сьвінаматак.

Аднэй з галоўных прычын такога ходу будаўніцтва зьяўляюцца наплюйскія адносіны Белсельбуду і дырэкцыі саўгасу да бытавога абслугоўваньня рабочых-будаўнікоў. 105 рабочым няма дзе начаваць. Значная частка рабочых сьпіць на голых тапчанах, бо да гэтага часу не паклапаціліся загатовіць матрацы. Ня гледзячы на тое, што абсталяваньне для лазьні ёсьць, яе ніяк не зьбяруцца пабудаваць. Рабочыя запрапанавалі былі арганізаваць спэцыяльны суботнік, каб, пазраніце, пабудаваць лазьню, але гэта прапанова ня сустрэла падтрыманьня з боку адміністрацыі. Ёсьць выпадкі, калі рабочыя па паўтара месяца не атрымліваюць зарплаты. Частка рабочых нярэдка застаецца без абеду, бо харчаваньне не наладжана (страва прывозіцца з Чэрыкава).

У выніку — цякучасьць рабочай сілы, прастоі. Ні райпрафсавет, ні рабфком не рэагуюць на ўсе гэтыя вялікія недахопы.

Трэба рашуча пакончыць з абураючымі агіднасьцямі, якія наглядаюцца на будаўніцтве ў саўгасе «Чырвоны Кастрычнік». Неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у зрыве будаўніцтва. Трэба мабілізаваць масу рабочых, якая працуе на будаўніцтве, а таксама і пастаянных саўгасных рабочых на фарсаваньне скончэньня пабудоў.

Ваўчкоў.

Пабудован толькі адзін сьвінарнік

ДУБРОЎНА. Будаўніцтва ў сьвінасаўгасе «Халоўе» праходзіць марудным тэмпам. Скончан толькі адзін сьвінарнік. 1.349 сьвіней прыпалося разьмясьціць па хлявох у пяці пунктах, якія знаходзяцца на адлегласьці ад 3 да 7 кілёмэтраў ад саўгасу. Такое становішча не дае магчымасьці як належыць наладзіць абслугоўваньне сьвіней і ўскладняе правільную расстаноўку рабочай сілы.

Не падрыхтаваны да зімы і старыя сьвінарнікі. Яны не адрамантаваны, без падлог, не ацеплены.

Саўгас не падрыхтаваўся і да апаросу. Дырэктыва аб пераводзе на зьдзельшчыну і ліквідацыі абязьлічкі ня выканана.

Такое становішча зьяўляецца вынікам бязьдзейнасьці і стаўкі на самацёк, якая праяўляецца трыкутнікам.

Ёсьць усе магчымасьці і ўмовы для таго, каб пасьпяхова скончыць будаўніцтва.

Іх трэба толькі выкарыстаць. Сьвінарнікі могуць і павінны быць па будаваны.

Байманаў.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б склікае 18-га лістапада г. г., у 7 гадз. веч., у памяшканьні Дому Камасьветы

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ.

ПАРАДАК ДНЯ:

Вынікі лістападаўскага аб'яднанага Пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Члены і кандыдаты ЦК і ЦКК КП(б)Б, Гаркому і Гар. КК КП(б)Б праходзяць на сход партактыву па сваіх мандатах.

Прапануецца сакратарам партколектываў і ячэек атрымаць білеты на сход партактыву ў Гарокме КП(б)Б, 18-га лістапада, з 9-ці да 4-х гадз. дня (пакой № 10).

Менгарком КП(б)Б.

ЗІМА НЕ ЗА ГАРАМІ

Кожны раён і калгас павінны поўнасьцю скарыстаць апошнія дні замаразкаў і пасьпяхова скончыць зяблевае ворыва

Як і раней работа праходзіць самацёкам

АСІПАВІЧЫ. За апартуністычную практыку ў рабоце мінулы склад райкалгассаюзу распушчаны. Але гэта не паслужыла ўрокам для новага складу праўленьняў. Дырэктыўныя указаньні і пастановы цэнтральных органаў па зяблеве да калгасаў не даведзены. Як выконваюцца пастановы ЦК аб пераключэньні 75 проц. коняй на зяблеве ворыва—у райкалгассаюзе вестак няма. Бязьдзейнасьць сучаснага складу праўленьня райкалгассаюзу ставіць выкананьне пляну зяблевага ворыва пад пагрозу зрыву. На 15-га лістапада калгасы выканалі план толькі на 52 проц.

На раёне план выкананы на 45 проц. Мізэрны процант выкананьня ёсьць нішто іншае, як вынік недаацэнкі кіруючымі раённымі арганізацыямі гаспадарча-палітычнай важнасьці галоўнейшай задачы ў даны момант—зяблевага ворыва.

За ўвесь асенні сэзон РВК вынес адну пастанову аб пераключэньні 75 проц. коняй на зяблева, выкананьне якой не правяралася. Раённая газэта «Калгасная праўда» не мабілізавала калгасную і бяднацка-серадняцкую масу на выкананьне пляну зяблева. За ўвесь асенні сэзон яна толькі 15-га кастрычніка зьмясьціла маленькую заметку пад назвай: «Парады агранома», а за ўвесь верасень месяц і зараз газэта пра зяблева нічога не зьмяшчае.

У выніку адсутнасьці масавай работы сярод калгасьнікаў і бяднацка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў мы маем нязначнае выкананьне пляну зяблева па радзе сельсаветаў. Так, Ланіцкі сельсавет план зяблева выканаў на 37 проц., Верайцоўскі—на 35 проц. і Гродзенскі—на 40 проц. Калгас «Слава» ня ўзнімае зяблева толькі таму, што яму не прысылаюць трактараў. У той-жа час конская цяга не скарыстоўваецца. Калгас «Камінтэрн» яшчэ не пачынаў зяблевага ворыва.

Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны дабіцца неадкладнага пералому, каб у бліжэйшы час план быў выкананы поўнасьцю.

Барысэвіч.

Перакінута на зяблева толькі 17 трактараў

ВУШАЧЫ. (БЕЛТА).

Зяблевае ворыва ў Вушацкім раёне пастаўлена пад удар. На 17 лістапада плянавае заданьне па раёне выкананa на 35 проц. Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб пераключэньні на зяблевае ворыва ня менш 50 проц. конскай і 100 проц. трактарнай сілы па выкананa. З 37 трактараў на зяблева перакінута толькі 17.

Такога становішча нельга цярпець. Да замарозкаў засталіся лічаныя дні. Дырэктыва партыі аб пераключэньні цягавай сілы на зяблева павінна быць зараз-жа выкананa.



Дамы для рабочых Асінаўскай электрастанцыі (СталЬГРЭС)

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

СПРАВА ПАРТЫЙНАЙ АСЬВЕТЫ

павінна займаць увесь час чеаслабную ўвагу кожнай ячэйкі КП(б)Б

„БЕЗ УЗБРАЕНЬНЯ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ НЯ МОЖА БЫЦЬ ПАСЬПЯХОВАЙ БАРАЦЬБЫ З ПРАВЫМ І „ЛЕВЫМ“ АПАРТУНІЗМАМ У ТЭОРЫІ І ПРАКТЫЦЫ, НЯ МОЖА БЫЦЬ БАРАЦЬБЫ ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ ВЫКАНАНЬНЯ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ“.

(З лісту ЦК КП(б)Б аб перавыбарах парторганаў).

За якасьць работы сеткі партасьветы

Марксыцка-ленінскае выхаваньне пастаўлена ва ўсёй шырыні перад партарганізацыямі, як важнейшая і неабходнейшая ўмова далейшай пасьпяховай барацьбы за выкананьне задач партыі ў новай абстаноўцы сацыялістычнага будаўніцтва. Задачы павышэньня тэарэтычнага ўзроўню камуністаў выразна вызначаны ў дырэктывах ЦК КП(б)Б аб разгортваньні партвучобы ў новым навучальным годзе.

З пачатку вучобы ў сеткі партасьветы прайшло ўжо каля двух месяцаў. Тэрмін даволі выстарчальны для таго, каб забясьпечыць правільную пастаноўку работы ў кожнай школе і гуртку ў тых партарганізацыях, якія несваячасова разгарнулі падрыхтоўчую работу да навучальнага году і не забясьпечылі пачатку заняткаў у вызначаныя тэрміны. Аднак, матар'ялы, якія сёньня мы зьмяшчаем, сьведчаць аб тым, што партвучоба ў радзе ячэек і ў паасобных раённых партарганізацыях (Бабруйск, Гомель і інш.) пастаўлена вельмі дрэнна. Калі, напрыклад, у Любаньскай раённай партарганізацыі амаль ні адзін камуніст не застаўся па ахопленым тым ці іншым відам партвучобы, у Бабруйскім ахоплена вучобай толькі ўсяго **23 проц.** камуністаў. Там-жа ў процілегласьць простым дырэктывам партыі аб абавязковым ахопе вучобай усіх кандыдатаў, толькі 25 проц. уцягнуты ў сетку партасьветы.

Найбольш агульным недахопам у рабоце раду зьвеньняў партарганізацый па разгортваньні партвучобы зьяўляюцца фармальныя адносіны да гэтай важнейшай задачы. Укамплектавалі сетку слухачамі, вылучылі прапагандыстаў і палічылі, што па гэтым справа скончана. А як пастаўлена вучоба, ці ў кожнай школе гэта вучоба ўвязваецца са штодзённай практычнай работай—гэта нібы справа другараднага характару. Такіх зьявішч нельга цярпець. **Барацьба за якасьць работы ўсёй сеткі партасьветы,** за бесьперабойныя заняткі пры поўным паводваньні слухачоў павінна займаць увесь час неаслабную ўвагу кожнай парт'ячэйкі. Трэба рашуча пакончыць з усялякім апраўданьнем, з беспадстаўнымі спасылкамі на аб'ектыўныя прычыны перабояў у занятках. Толькі пры гэтых умовах можна ўзьняць справу партасьветы на вышэйшую задач сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва.

У апублікаванай сёньня пастанове сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб становішчы партасьветы ў Бабруйскай партарганізацыі падкрэсьліваецца, што «Бабруйская партарганізацыя зможа з посьпехам справіцца з усімі канкрэтнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва толькі пры ўмове поўнага забясьпячэньня марксыцка-ленінскага выхаваньня партыйных мас і мабілізацыі іх на барацьбу за генэральную лінію партыі...» Гэтым палажэньнем вызначаюцца задачы ня толькі Бабруйскай партарганізацыі, а кожнай ячэйкі КП(б)Б, кожнай раённай партарганізацыі.

Аб становішчы партасьветы па Бабруйскім раёне

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Сакратарыят ЦК КП(б)Б канстатуе, што ня гледзячы на рад дырэктыў ЦК КП(б)Б і Бабруйскага РК у рабоце Бабруйскай партарганізацыі па разгортваньні марксыцка-ленінскага выхаваньня мае месца рад буйных прарываў і недахопаў. Галоўнейшымі з іх зьяўляюцца:

а) Зусім слабое разгортваньне сеткі партасьветы па раёне і ахоп ёю мас партыйнаў, камсамольцаў і беспартыйных рабочых і калгасьнікаў, асабліва кандыдатаў і новых членаў партыі. (Усяго па раёне ахоплена: партыйцаў на 15/X—31 г.—23 проц., кандыдатаў—25 проц. да агульнага ліку кандыдатаў і беспартыйных, ці (37 проц. да агульнага складу ўсіх слухачоў партасьветы).

б) Зрыў курсаў гарадзкіх і вясковых прапагандыстаў, у выніку чаго сетка масавай партасьветы па раёне не забясьпечана прапкадрамі.

в) Дрэнная якасьць выкладаньня і паасобныя выпадкі скажэньняў ідэалёгічнага зьместу вучобы, асабліва ў школах і гурткох масавай партасьветы з-за адсутнасьці матэдычнай дапамогі прапагандыстам.

г) Партасьвета ў значнай колькасьці прадпрыемствах (хлебазавод, «Чырвоны харчавік», Эльвод, «Камінтэрн» і інш.), а таксама па вясковых ячэйках яшчэ не распачата. Там дзе ўжо і распачата (камбінат, швэйная ф-ка і інш.), намядаецца вялікі адсеў, які даходзіць у паасобных школах да 60-70 проц.

д) Адсутнасьць школ і гурткоў партасьветы на мовах нацменшасьцяй (яўрэйская і польская).

е) Наяўнасьць апартуністычнай педаацэнкі партасьветы з боку значнай часткі парт'ячэек і асобных таварышоў з райпартактыву (на камбінаце: лесцэх, стандартны цэх, фанэрны цэх, хлебазавод, швэйная ф-ка, «Камінтэрн» і інш.).

Сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае, што партарганізацыя Бабруйшчыны зусім недастаткова мабілізавана на ажыцьцяўленьне задач партыі па марксыцка-ленінскім выхаваньні мас. Дырэктывы ЦК КП(б)Б па ператварэньні ўсёй работы па камплектаваньні і арганізацыі сеткі партасьветы ў масавую палітычную кампанію выконваецца нездавальняюча.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б прапануе:

1. РК КП(б)Б і парт'ячэйкам арганізаваць прапраноўку прамовы т. Постышава і забясьпечыць неадкладнае ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК КП(б)Б аб разгортваньні марксыцка-ленінскага выхаваньня мас партыйцаў і камсамольцаў, беспартыйных рабочых і калгасьнікаў, мабілізаваўшы райпартактыў на канкрэтную дапамогу нізавым ячэйкам. У месячны тэрмін дабіцца выкананьня кантрольных лічбаў разгортваньня партасьветы па раёне, зацьверджаных Бюро ЦК, асабліва 100 проц. ахопу партвучобай кандыдатаў і новых членаў партыі.

2. Забясьпечваючы шырокую масавапалітычную работу па мабілізацыі мас партыйцаў на хутчэйшую ліквідацыю адзначаных прарываў і недахопаў, разгарнуць сацыяльніцтва і ўдарництва вакол партасьветы ў раёне. Весьці далейшую бязьлітасную барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай партасьветы, асабліва з боку кіраўніцтва ячэек і райпартактыву (сакратар парткалектыву шэйфабрыкі і інш.).

Райкому і ячэйкам забясьпечыць барацьбу з паасобнымі скажэньнямі ідэалёгічнага зьместу партвучобы, рашуча палянішаючы сыстэматычнае кіраўніцтва і падрыхтоўку ўсіх прапагандысцкіх кадраў раёну праз арганізацыю прапсэмінараў на больш буйных прадпрыемствах (камбінат, швэйная ф-ка, «Камінтэрн»), пры Доме Камасьветы й пры сельпарткомах. У рабоце сеткі партасьветы забясьпечыць рэалізацыю дырэктыў ЦК КП(б)Б аб ператварэньні кожнай школы і гуртка партасьветы ў сапраўдных дапаможнікаў партарганізацыі ў справе ажыцьцяўленьня канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва на даным раёне (выкананьне прамфінпляну, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, загатоўкі і г. д.).

Адзначаючы вялізарнае палітычнае значэньне пасьпяховага завяршэньня загатовак у раёне, сканчэньне ворыва зябі, правядзеньне перакапаньня бульбы, сакратарыят прапануе мабілізаваць увагу ўсёй сеткі партасьветы на выкананьне гэтых важнейшых задач.

Сетка партасьветы павінна праводзіць штодзённую рашучую барацьбу з буржуазнымі тэндэнцыямі, якія праяўляюцца з боку асобных вывеньняў саўгасна-калгаснага сэктару (нязлача збожжа дзяржаве, самазабесьпячэньне і інш.).

4. Праз арганізацыю месячных курсаў правесьці тэрміновую падрыхтоўку прапагандыстаў, асабліва для вясковай сеткі партасьветы (ня менш як 50 чалавек) РК і культпропу ЦК КП(б)Б забясьпечыць гэтыя курсы адпаведнымі матар'яльнымі сродкамі і кіраўнікамі.

5. ЦК катэгарычна прапануе райкому поўнасьцю забясьпечыць выкананьне дырэктыў ЦК аб тэарэтычнай падрыхтоўцы партактыву. У дэкадны тэрмін вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па гэтым пытаньні, у прыватнасьці распачаць работу дэкаднага Камвузу ў порадзе і на камбінаце, складаючы неабходныя ўмовы для вучобы актыву (прадстаўленьне дня вучобы і г. д.).

6. Адзначаючы нездавальняючую работу па разгортваньні палітасьветы камсамолу ў раёне і аусім слабую дапамогу камсамольскай арганізацыі ў гэтай рабоце з боку партарганізацыі, прапанаваць РК і ячэйкам на бліжэйшых пасяджэньнях бюро заслухаць даклады РК КСМ і ячэек па гэтым пытаньні, вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэньні палітасьветы ў камсамольскай арганізацыі, у прыватнасьці забясьпечыць падрыхтоўку новых і перападрыхтоўку наяўных кадраў кіраўнікоў камсамольскай палітасьветы з складу партарганізацыі, забясьпечыць літаратурай і сыстэматычным матэдкіраўніцтвам.

7. Культпропу ЦК КП(б)Б і РК забясьпечыць усю сетку партасьветы раёну патрэбнай літаратурай (падручнікамі, праграмамі і г. д.) асабліва на беларускай мове і мове нацменшасьцяй.

8. Паляпшаючы работу па беларусізацыі сеткі партасьветы раёну, стварыць сетку школ і гурткоў на мове нацменшасьцяй, асабліва яўрэяў і палякаў (шэйная ф-ка, камбінат, «Камінтэрн» і інш.).

9. Адзначаючы нездавальняючае становішча завочнага навучаньня па раёне прапанаваць РК і ячэйкам поўнасьцю выканаць разьвёрстку ЦК аб камплектаваньні завочных форм партасьветы, мець пастаянны вучот гэтай работы, арганізаваць штодзённую дапамогу завочнікам у іх рабоце (кансультацыя, канфэрэнцыі і г. д.), вывярнуць асаблівую ўвагу на ахоп завочным навучаньнем райпартактыву.

10. ЦК падкрэсьлівае, што Бабруйская партарганізацыя зможа пасьпяхова справіцца з усімі канкрэтнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва толькі пры ўмове поўнага забясьпячэньня марксыцка-ленінскага выхаваньня партыйных мас, мабілізацыі іх на барацьбу за генэральную лінію партыі, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі, супроць «лявацкіх» загібаў і прымірэнцтва да іх.

Марксыцка-ленінскае выхаваньне—тысячам новых камсамольцаў

Камсамольская арганізацыя Беларусі набыла значныя посьпехі ў справе рэалізацыі гістарычнай пастановы 9-га зьезду УсеЛКСМ аб ператварэньні камсамолу ў шматмільённую арганізацыю. За апошнія 6 месяцаў прынята ў рады ЛКСМБ 66 тыс. чал. рабочай і калгаснай моладзі.

Асаблівасьці росту данага пэрыяду заключаюцца ў тым, што ў рады камсамолу ўліваецца шмат моладзі, якая нядаўна прышла на вытворчасьць, з непралетарскага асяродку. Гэта моладзь не прайшла суровай школы грамадзянскай вайны, школы барацьбы з клясавым ворагам. Адсюль ва ўсю шырыню паўстае задача шырокага разгортваньня работы па марксыцка-ленінскім выхаваньні.

Практычная задача кожнай нізавой ячэйкі, партгрупы, заключаецца ў тым, каб замацаваць палітычную актыўнасьць новаўступіўшых у камсамол, накіраваць яе цалкам на пасьпяховае выкананьне чарговых задач партыі. Правядзеньне гэтай работы павінна быць справай ня толькі камсамольскай арганізацыі. Тут патрабуецца асаблівая ўвага і дапамога з боку партыйных арганізацый. «Спадзявацца і разьлічваць на сілы толькі камсамолу у гэтай справе, справе марксыцка-ленінскага выхаваньня новых 2-5 мільёнаў камсамольцаў ніяк ня прыходзіцца. Камсамол сам гэтую складаную задачу ня выцягне, таму ўвагу партыйных арганізацый да пастаноўкі марксыцка-ленінскага выхаваньня ў камсамоле неабходна ўзмацніць, дапамагаючы прапагандысцкімі сіламі, матар'яльнымі сродкамі і ў штодзённым кіраўніцтве». (Постышаў).

Аналізуючы стан палітвучобы ў арганізацыі ЛКСМБ, трэба зрабіць вывад, што, ня гледзячы на асобныя дадатнія бакі ў гэтай рабоце, усё-ж тэарэтычная вучоба і непасрэдная сувязь яе з практычнай работай пастаўлена нездавальняюча.

Асноўнае зьвяно ў сыстэме палітасьветы — палітмінімум, якім павінны быць ахоплены ўсе малапісьменныя і напісьменныя камсамольцы вёскі, праводзіцца далёка ня так, як гэта трэба. Усяго палітмінімумам ахоплена 50-60 проц. камсамольцаў, а з пытаньнем якасьці прапрацоўкі яшчэ горш. Зараз неабходна пераключыцца на асноўную сетку на вёсцы — пачат ковыя палітшколы. Увага да гэтай справы з боку райкомаў партыі і ячэек КП(б)Б павінна быць значна павышана.

Пэрліна.

М. Ганчарык.

Праблемы навукова-дасьледчай работы ў галіне біялёгічных дысцыплін

Навука па службе пралетарыяту ў пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня павінна ўзьняць на вышэйшую ступень тэхніку ўсяго нашага будаўніцтва, адкрыць найвялікшыя магчымасьці далейшага росту тэмпаў якаснага і колькаснага руху наперад, даць поўную магчымасьць шырокім рабочым масам «па-сапраўднаму аўладаць вытворчасьцю, яе тэхнікай, яе фінансава-эканамічным бокам», аб чым гаварыў т. Сталін у сваёй прамове па нарадзе гаспадарнікаў.

Задачы, якія стаяць перад навукова-дасьледчымі ўстановамі, могуць быць выкананы толькі пры ўмове самай цеснай увязкі навукова-дасьледчай работы з усім ходам сацыялістычнага будаўніцтва, пры ўмове, калі навукова-дасьледчая работа стане неадрыўнай, сустаўнай часткай усяго сацыялістычнага будаўніцтва. Прынцып адзінага народна-гаспадарчага пляну павінен падпарадкаваць сабе ня толькі ўсе бакі і галіны гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, **але таксама і ўсе галіны навукі і навуковага дасьледу.**

Строгае плянаваньне навукова-дасьледчай працы павінна зьявіцца адпраўным пунктам у пабудове яе тэматыкі, у праблематыцы, тэмпах. Пасьпяховае закончэньне трэцяга году пяцігодкі і складаньне плянаў 2-ой пяцігодкі, за час якой будаўніцтва сацыялізму значна пасунецца наперад, зусім па-новаму ставяць пытаньне аб бліжэйшых пэрспэктывах навуковай і навукова-дасьледчай работы, сьціраючы межы паміж разумовай і фізычнай працай, зусім інакш ставячы іх узаемаадносіны.

Гэта зараз ужо вымагае ад кожнай навукова-дасьледчай установы неадкладных захадаў да перабудовы сваёй работы на аснове строгага плянаваньня, з поўнай увязкай з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, з больш цеснай сувязьзю з самой вытворчасьцю, з калектыўнасьцю і сацыялістычнымі мэтадамі ў працы, з новымі бальшавіцкімі тэмпамі.

У сучасны момант у галіне біялёгічных дысцыплін паасобныя навукова-дасьледчыя ўстановы БССР маюць вялікія дасягненьні. Але вельмі часта гэтыя дасягненьні застаюцца мала вядомымі ня толькі для скарыстаньня іх у шырокай практыцы, але нават і другім навукова-дасьледчым установам для мэт далейшай прапрацоўкі розных пытаньняў. Мы ня толькі ня маем шырокай практыкі абмену сацыялістычным вопытам у галіне навуковага досьледу, для безадкладнага скарыстаньня кожнай установай дасягненьняў і вопыту другіх, мы ня маем яшчэ ў гэтай галіне бальшавіцкіх мэтадаў укараненьня гэтых дасягненьняў у практыку нашага будаўніцтва. З другога боку **адсутнасьць сёзнага пляну навукова-дасьледчай працы ў біялёгічных галінах** прыводзіць яшчэ і зараз да паралелізму ў распрацоўцы паасобных праблем з аднаго боку, з другога—**актуальнейшыя пытаньні застаюцца без вырашэньня.**

Асаблівую ўвагу павінна аддаць Беларуская Акадэмія Навук і яе біялёгічны інстытут пытаньням плянаваньня і арганізацыі навукова-дасьледчай працы БССР.

Калі ў іншых галінах навукі за апошнія часы праведзена вялікая работа ў справе барацьбы за правільную марксыцка-ленінскую лінію, за клясавую вытрыманасьць навукова-дасьледчай работы, за аўладаньне мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, дык у галіне біялёгічных дысцыплін гэта работа толькі зараз пачынае разгортвацца.

Барацьба з мэханіцызмам, як галоўнай небясьпекай на біялёгічным фронце ў сучасны момант, меншавіцтвую чым ідэалізмам і рознымі іншымі плынямі не знайшла сабе належнага месца ў БССР. У выніку гэтага мы маем рад трубейшых скажэньняў марксыцка-ленінскага мэтаду: рад вялізарнейшых памылак у розных навуковых работах па біялёгіі не знайшлі яшчэ і да гэтага часу належнай крытыкі. І гэта асабліва адчуваецца ў галіне сельскай гаспадаркі, якая больш за ўсё зьвязана з дасьледчай работай па біялёгіі.

На Украіне ня так даўно прышлося сустрэцца і разгарнуць рашучую барацьбу з тэорыяй Янната, якая даказвала незаменнасьць абарыгенных гатункаў сельска-гаспадарчых культур, якія па Янату прайшлі прыродны адбор і зьяўляюцца найбольш пры стасаванымі. У БССР у адносінах да гатункаў азімага жыта наглядаецца нешта падобнае, з тэй толькі розьніцай, што ў аснову кладзецца сьляпое праклапаненне перад усім замежным. Варта напомніць, што многія мясцовыя гатункі, якія выведзены савецкімі вучонымі, напрыклад, «Авангард» пакідаецца бяз услякай увагі, а стаўка бярэцца на нямецкі «Пяткускі» гатунак жыта, ня гледзячы на тое, што паказальнікі перазімоўкі гаворыць зусім не ў карысьць «Пяткускага» гатунку...

У практыцы нашай гаспадаркі такія ўстаноўкі некаторых спэцыялістаў НКЗ і збожжавай станцыі прынесьлі дзяржаве ў гэтым годзе страты на дзесяткі тысяч цэнтнэраў азімага жыта.

У якасьці другога прыкладу можна паказаць на работу Астроўскага і Сідарука ў галіне арганізацыі насеннага бульбаводзтва ў БССР «Да арганізацыі насеньнаводзтва бульбы і апісаньне галоўных гатункаў у саўгасах БССР» (Выданьне НКЗ БССР), дзе аўтары, ігнаруючы мясцовы досьвед дылектычнага матэрыялізму, далі зусім няправільнае разуменьне аб гатунках і паказалі грубае невуцтва ў пытаньні чыстагатункавасьці насеву. На аснове гэтых яўна шкодных установак, што былі прыняты спэцыялістамі НКЗ, на працягу 2-х год размножваўся і пашыраўся па СССР нікуды ня варты гатунак «Грацыя», які пакінуў многія саўгасы і калгасы на бліжэйшы час без гатункавага насеньня бульбы.

Калі ў падобных выпадках значную частку віны можна аднесьці на невуцтва саміх працаўнікоў, то далёка гэтага нельга сказаць пра такога вучонага, як В. В. Вінэр, які ў часопісі «Сельская і лясная гаспадарка» пісаў:

«Нешта падобнае да сымбіёзу мы знаходзім у прыродных згуртаваньнях расьлінасьці па лугох і выпасах і больш глыбокае вывучэньне такіх згуртаваньняў дазволіць высьветліць тыя ўласьцівасьці расьлін, якія абумоўліваюць іх здольнасьць да сацыяльнага жыцьця, а гэта ў сваю чаргу дасьць нам карысьць пры складаньні мяшанак для штучных лугоў і выпасаў. Да некаторай ступені і мяшаныя палявыя заевы і так званыя пакрыўныя і пасеўныя культуры павінны здавальняць запатрабаваньні ўзаемнай прыстасаванасьці ці сацыяльнай гармоніі». («Сельская і лясная гаспадарка», кн. 10, № 2-3, 1930 г., ст. 63).

Ня цяжка зразумець, да якіх вынікаў мы прышлі-б у справе разьвіцьця нашай сельскай гаспадаркі, калі-б па чалі скарыстоўваць установкі Вінэра ў культуры мяшаных пасеваў, пакрыўных і пасеўных расьлін. Але гэта ня здарылася і, будзем спадзявацца, і ня здарыцца.

Тут цікава яшчэ і тое, што па сутнасьці Вінэр гэтым самым цьвярджаў нем выступае супроць клясавай барацьбы, «за сацыяльную гармонію», за лёзунгі міжнароднага сацыял-фашызму, падносячы іх у форме грубага мэханізму. Гэта толькі больш разгорнутае, больш выразнае тлумачэньне тэрміну фітасацыялёгіі, за якую і да гэтага часу трымаюцца нашы некаторыя вучоныя.

Прыведзеныя прыклады не адзіныя, але іх даволі, каб зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на біялёгічны фронт, каб павесьці рашучае змаганьне з усякімі скажэньнямі марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі ў навуковай працы.

Усё гэта ўскладае па нас поўны абавязак па стварэньні навуковых дасьледчых кадраў з асяродзішча рабочае клясы, а таксама па аказаньні пэўнай дапамогі нашым маладым навуковым працаўнікам па ўладаньні мэтадалёгіі марксызму-ленінізму.

Адначасова трэба адзначыць, зусім нездавальняючае становішча і ў справе плянаваньня навукова-дасьледчай працы ў галіне біялёгічных дысцыплін. Калі па пытаньнях дасьледчай працы па сельскай гаспадарцы мы маем даволі распрацаваную і ўвязаную з вытворчымі галінамі сыстэму навукова-дасьледчая работа. Адначасова не заўсёды існуючыя ўстановы стаяць на належнай вышыні як па адпаведнасьці запатрабаваньням сацыялістычнага будаўніцтва, тэматыцы, так і па выкананьні самой працы. Ва многіх выпадках тэматыка работы дасьледчых устаноў складаецца з разрозьненага і вялікага набору тэм, часамі не адпавядаючых напрамку працы ўстановы і непасільных для выкананьня па сваёй перагружанасьці (харкавая сэкцыя санітарна-гігіенічнага інстытуту).

У тэматыцы некаторых устаноў можна знайсьці нмат непатрэбнага, малактуальнага па сённешні дзень, паралельнага таму, што праводзіцца іншымі ўстановамі Савецкага Саюзу. Напрыклад, распрацоўка пытаньняў сыстэматыкі бульбы па бульбяной станцыі ў той час, калі гэта пытаньне ўсесаюзным бульбяным інстытутам распрацоўваецца больш пастаянна і сур'ёзна па Ленінградзкай зональнай станцыі і інш.

У пытаньні падрыхтоўкі біялёгічных кадраў інстытуту асьпірантуры БАН і інстытуту сац. рэканструкцыі патрэбна безадкладна ўзмацніць тэмы. Нашы інстытуты асьпірантуры ў сучасны момант зусім не падрыхтоўваюць асьпірантуры ў такіх галінах, як гідрабіялёгія, мікрабіялёгія, мікалёгія, не гаворачы ўжо аб вялікім недахваце асьпірантуры, які ёсьць па іншых галінах, як: фітапаталёгія, зоалёгія, батаніка і інш.

Па многіх зональных станцыях і інстытутах сыстэмы НКЗ адсутнічаюць зусім разьдзелы працы па фізіялёгіі на прычынах адсутнасьці кадраў. У той час, як фізіялёгія зьяўляецца абавязковай часткай дасьледаў па агратэхніцы, сэлекцыі і фітапаталёгіі, хаваньні ўраджаю, а таксама мала кадраў па фітапаталёгіі, энтамалёгіі і інш. У той-жа час інстытут асьпірантуры пры інстытуце сац. рэканструкцыі ня выканаў нават і напалову намечанага пляну набору асьпірантаў па ўстановах сваёй пэрыферыі, а інстытут асьпірантуры БАН у праведзеным зараз наборы мае толькі аднаго асьпіранта па біялёгічных дысцыплінах.

Перад Беларускай Акадэміяй Навук і ўсёй вострасьцю паўстае важнейшая неадкладная задача — складаньне агульнага для ўсёй БССР пляну навукова-дасьледчай работы—сустаўной часткі народна-гаспадарчага пляну. Акадэмія праз сыстэму сваіх інстытутаў і ў першую чаргу праз біялёгічны інстытут павінна пачаць глыбокую распрацоўку пытаньняў, што стаяць перад навукова-дасьледчай работай у галіне біялёгіі.

Інстытут філёзофіі БАН, [redacted] тва марксыстаў-дылектыка[redacted] усім навукова-дасьледчымі [redacted] мі ўстановамі БССР павінны безадкладна разгарнуць барацьбу з усякімі скажэньнямі марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі, за партыйнасьць у навуцы, бо толькі праз чыстату мэтадалёгіі Маркса і Леніна навукова-дасьледчая работа стане сапраўдным дапаможнікам нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

„Разьвіць узмоцненую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў“ (ЦК УсеКП(б)

НЕ ЗАТРЫМЛІВАЦЬ ВЫДАЧЫ АВАНСАЎ КАЛГАСЬНІКАМ

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕМ ДАХОДАЎ ПА ПРАЦАДНЁХ І СВАЯЧАСОВАЙ ВЫДАЧАЙ АВАНСАЎ ДАБ'ЕМСЯ ПАСЬПЯХОВАГА СКАНЧЭНЬНЯ УСІХ АСЕНЬНЯ ГАСПАДАРЧЫХ КАМПАНІЙ

Больш апэрацыйнага кіраўніцтва

разьмеркаваньнем даходаў у калгасах

Бюро ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 10 лістапада падкрэсьліла, што «партыйныя арганізацыі яшчэ не пераключыліся на вырашэньне па-баявому цэнтральнай задачы, якая стаіць перад партарганізацыяй у калгасным будаўніцтве—гэта на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў».

У бліжэйшыя два месяцы асноўным зьвяном гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, за якое трэба ўхапіцца, зьяўляецца кампанія разьмеркаваньня даходаў па працаднёх. Аднак, яшчэ ня ўсе раённыя партарганізацыі, райгазэты і нізавы друк ухапіліся за гэта зьвяно.

Да 15 кастрычніка трэба было ва ўсіх калгасах БССР скласьці праекты разьмеркаваньня і выдаць калгасьнікам авансы ў разьмеры 50-75 проц. даходаў.

Між тым паводле даных Белкалгасцэнтру на 10 лістапада склалі праекты 62,7 проц. усіх калгасаў, а выдалі авансы ў лік даходаў усяго толькі 55,3 проц. Асабліва ганебна цягнуцца ў хвасьце раёны: **Плешчаніцкі,** у якім з 257 калгасаў выданы авансы ў 64-х, **Рэчыцкі** з 133—у 25, **Менскі** з 127—у 41 і г. д. Ідуць першымі: **Лепельскі** раён, дзе ва ўсіх 122 калгасах авансы сваячасова выданы, **Полацкі**—з 214 выданы ў 192.

Сваячасовае складаньне папярэдніх праектаў разьмеркаваньня даходаў і выдача авансаў мае рашаючае значэньне для ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы сярод калгасьнікаў, для пасьпяховага сканчэньня ўсіх асеньня-гаспадарчых кампаній.

Таму зусім няма нічога дзіўнага, што ў тых калгасах, дзе затрымліваюць выдачу авансаў, дзе замест разьмеркаваньня даходаў па працаднёх пад уплывам кулацкай агітацыі дапускаюць дробнабуржуазную ўраўнілаўку, аслабляецца працоўная дысцыпліна, павялічваецца навыхад на работу, ня выконваюцца пляны па зяблеве, апрацоўцы ільну і г. д.

Разьмеркаваньне даходаў па працаднёх адыгрывае ня меншую ролю ў справе сваячасовага выкананьня калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай па здачы (продажу) таварнай прадукцыі, па выкананьні плянаў збожжазагатовак. Калгасы, якія разьмеркавалі даходы выключна па колькасьці і якасьці працы і выдалі авансы калгасьнікам, з посьпехам спраўляюцца з загатоўкамі.

Усё гэта абавязвае кожную раённую партарганізацыю і зямельна-калгасныя органы ні ў якім разе не затрымліваць складаньне праектаў і выдачу авансаў ва ўсіх калгасах БССР. Гэтай найважнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі неабходна падаць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва. Трэба абавязкова выканаць пастанову бюро ЦК КП(б)Б аб прымацаваньні да групы ў 5-10 калгасаў адказных партработнікаў, якія-б дапамагалі і адказвалі перад райкомам за разьмеркаваньне даходаў у даручаных ім калгасах.

Узмацніўшы тэмпы складаньня папярэдніх праектаў разьмеркаваньня, кожная партарганізацыя, павінна ў бліжэйшыя-ж дні дабіцца выдачы 50-75 проц. авансаў у лік даходаў ва ўсіх калгасах. Прыцягваць да самай суровай адказнасьці тых, што дапускаюць дробна-буржуазную ўраўнілаўку, затрымліваюць выдачу авансаў, чым затрымліваюць выкананьне плянаў загатовак і даюць кулаку глебу для распальваньня спажывецкіх настрояў сярод адсталай часткі калгасьнікаў.

Гастролі кулацкага агента Козінцава

ЕЛЬСК. «Зьвязда» 28 кастрычніка ўжо зьмяшчала карэспандэнцыю сялькора аб тым, што інструктар райкалгассаюзу **Козінцаў** замест дапамогі калгасам у разьмеркаваньні даходаў і наладжваньні ўліку гастралюе па раёне і агітуе сярод калгасьнікаў «бульбу дзяржаве ня трэба здаваць, а трэба на кінуць выключна для ўласных патрэб». Гэты кулацкі агент пры складаньні пляну разьмеркаваньня натуральнай часткі ў калгасах «**Чырвоны трактарыст**», **імя Варашылава**, «**Новае жыцьцё**» і інш. дае такую дырэктыву —кармы (сена, канюшыну, бульбу) накінуць толькі на тое стада, якое ёсьць на дзень складаньня пляну, ня ўлічваючы прыплоду і далейшага камплектаваньня калгасных фэрм. Усе рэшта кармоў разьмяркоўваецца паміж калгасьнікаў.

Зусім зразумела, што калгасы, у якіх праводзіцца разьмеркаваньне на плянах, складзеных Козінцавым, і якія яшчэ далёка ня выканалі плянаў укамплектаваньня МТФ, хутка апынуцца без кармоў для абагуленай жывёлы.

Ня вытрымана з калгасаў Ельскага раёну і дробна-буржуазная ўраўнілаўка. Праўленьне калгасу «**Чырвоны кастрычнік**» злачынна ігнаруе прыняцьце разьмеркаваньня даходаў па працаднёх. Калгасьнік **Клубок** Васіль пры двух працаздольных, выпрацаваўшы 40 працадзён, атрымаў 120 пуд. бульбы, а **Бурда Алесь,** выпрацаваўшы з жонкай 487 працадзён, атрымаў усяго толькі 80 пудоў. У выніку няправільнага разьмеркаваньня частка калгасьнікаў кінула выходзіць на працу, працоўная дысцыпліна запанала.

Райпартарганізацыі разгортваньнем масавай работы трэба дабіцца выкананьня калгасамі плянаў па загатоўках, забясьпячэньня кармамі жывёлы на зімовы час шляхам максымальнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, канчатковага выкараненьня з калгаснай практыкі «лявацкай» дробнабуржуазнай ураўнілаўкі.

Кулацкіх агентаў тыпу Козінцава трэба анальітасна гнаць з радоў партыі.

Д. і В.

Растлумачэньне Белкалгасцэнтру на запытаньні месц

Аб парадку разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў у с.-г. камунах

У сувязі з запытаньнямі месц аб парадку разьмеркаваньня даходаў у с.-г. камунах і парадку вылучэньня прадукцыі для грамадзкага харчаваньня ў іх, растлумачыць, што:

1. У с.-г. камунах разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю ў 1931 г. павінна праводзіцца па такім-жа прынцыпе, як і ў с.-г. арцелях, г. зн. па колькасьці і якасьці працы, затраванай кожным камунарам.

2. Выходзячы з таго, што грамадзкае харчаваньне і ў с.-г. камунах арганізуецца выключна на аснове добраахвотнасьці і пажаданьня саміх калгасьнікаў, прадукты для грамадзкага харчаваньня вылучаюцца выключна тымі камунарамі, якія харчуюцца ў сталоўцы, і з тэй часткі прадуктаў, якая належыць да выдачы на рукі пры разьмеркаваньні і пры выдачы авансаў камунару, згодна выпрацаваных ім працадзён.

Аб удзеле ў разьмеркаваньні ўраджаю калгасьнікаў, якія не абагулілі сваіх пасеваў

Гаспадаркі, уступіўшыя ў калгас да калектыўнай сяўбы і пасьля не абагуліўшыя сваіх індывідуальных пасеваў (азімых і яравых), пры разьмеркаваньні натуральнай часткі культур, якіх яны не абагулілі, замест натуры, што належыць ім па працаднёх, атрымліваюць грошы. У выпадку масавага неабагульненьня, калгасьнікі, не абагуліўшыя сваіх пасеваў, удзельнічаюць у разьмеркаваньні толькі грашовай часткі даходаў на агульных падставах з усімі іншымі калгасьнікамі.

Аб в падках запазычанасьці па разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў за мінулы год

У сувязі з тым, што за мінулы год у некаторых калгасах, у выніку няправільнага падліку і разьмеркаваньня даходаў, засталася запазычанасьць калгасу калгасьнікам і наадварот, неабходна ў такіх калгасах праверыць разьмеркаваньне ўраджаю і даходаў за мінулы год і ў тых выпадках, калі запазычанасьць калгасу калгасьнікам стварылася з-за няправільнага падліку даходаў за мінулы год (калі ў даходы гаспадарчы былі залічаны кошт прыплоду і прыросту жывёлы, кошт працы калгасьнікаў у сваім будаўніцтве і г. д.), калгасы павінны правесьці калгасу павінны праверыць падлік даходаў за мінулы год і сьпісаць на аснове пастаноў агульных сходаў калгасьнікаў памылкова налічаныя калгасьнікам даходы, шырока растлумачыўшы апошнім шкоднасьць замешчанай у мінулым годзе памылкі. Калі частка калгасьнікаў у гэтых калгасах атрымала поўнасьцю або часткова не правільна налічаную ёй долю даходу за мінулы год, дык перабраная сума залічваецца авансам на гэтых калгасьнікаў. Аванс павінен быць пагашаны з даходу бягучага году і ў асобных выпадках часткова з даходу 1932 году. Утрыманыя сумы ідуць на выплату запрацаванай запазычанасьці калгасьнікам за мінулы год, а рэшта залічваецца ў неадзельны фонд.

Калі пры разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў у мінулым годзе калг

НІВОДНАГА ДЗІЦЯЦІ ПА-ЗА ШКОЛАЙ

У цэнтр увагі партыйных ячэек, органаў Нарасьветы, саветаў—ажыцьцяўленьне пастановы ЦК аб савецкай школе

УЗЬНЯЦЬ ЯКАСЬЦЬ МЭТАДЫЧНАГА КІРАЎНІЦТА

Бліжэйшыя дні павінны забясьпечыць карэнны зрух

Больш двух месяцаў прайшло з часу пачатку навучальнага году і апублікаваньня пастановы ЦК УсеКП(б) аб сярэдняй і пачатковай школе.

ЦК у пастанове аб школе, ставячы рад найважнейшых і адказьнейшых задач перад савецкай школай, адзначаючы, што яна (школа) яшчэ не адпавядае патрабаваньням данага этапу сацыялістычнага будаўніцтва, асноўны ўпор зрабіў па неабходнасьць перабудовы школы, палітэхнізацыі яе, павышэньня ролі агульна-асьветных дысцыплін ва ўсёй сыстэме камуністычнага выхаваньня.

Перабудова работы школы ва ўмовах усеагульнага навучаньня — гэта перш за ўсё выкананьне задачы аб стопроцантным ахопе дзяцей, складань не адпаведных умоў навучаньня і грунтоўнае дакладнае ажыцьцяўленьне прынцыпу камуністычнага выхаваньня.

Выкананьне гэтых задач савецкай школай немагчыма і нямысьліма бяз шырокага падтрыманьня ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, без кіраўніцтва і дапамогі савецкіх, прафэсыянальных і перш за ўсё партыйных арганізацый.

Матар'ялы, якія мы сёньня зьмяшчаем, паказваюць, што Аршанская і Мсьціслаўская партарганізацыі не прынялі належных захадаў да рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе.

Тое, што партыйныя ячэйкі не дабіліся стопроцантнага ахопу дзяцей школамі, не забясьпечылі нармальнай бесперабойнай работы ліквпунктаў і ахопу імі поўнасьцю напісьменных, не зрабілі ніякіх захадаў да арганізацыі матар'яльнага забясьпечаньня настаўніцтва і вучняў, не ўстанавілі кантролю за будаўніцтвам і рамонтам школ, лішні раз падкрэсьлівае наяўнасьць недаацэнкі ўсеагульнага навучаньня і школьнага будаўніцтва ў некаторых раёнах.

Аршанскія арганізацыі прынялі шмат прыгожых пастаноў аб рэалізацыі задач, высунутых ЦК нашай партыі перад савецкай школай, і літаральна пальцам аб палец ня стукнулі, каб правесьці свае пастановы ў жыцьцё.

Арганізацыя матар'яльнай базы для правядзеньня ўсеагульнага навучаньня зьяўляецца важнейшай задачай у рабоце кожнай партыйнай ячэйкі, сельсавету і органаў нарасьветы! Яна ў Аршанскім раёне ні партыйнымі ячэйкамі, ні сельсаветамі ня выканана.

Школы, што вызначаны плянам, не пабудаваны пры наяўнасьці ўсіх аб'ектыўных умоў і прадпасылак. Будаўніцтва сарвана выключна ў выніку непаваротлівасьці будаўнічых органаў, адсутнасьці ўсякага кантролю і праверкі становішча будаўніцтва партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі.

Становішча з правядзеньнем палітэхнізацыі зусім нездавальняючае.

Праваапартуністычныя элемэнты, адмаўляючы палітэхнізацыю, усе свае імкненьні накіроўваюць на тое, каб савецкую школу перавесьці на рэйкі старой схалястычнай школы. Работнікі аршанскага інспэктарыяту асьветы, адрываючы школу ад вытворчасьці, ня прымаючы ніякіх захадаў да заключэньня паміж школамі і прадпрыемствамі, саўгасамі, калгасамі дагавораў, да арганізацыі рабочых пакояў і майстэрань пры школах, тым самым дапамагаюць апартуністам зрываць палітэхнізацыю ў школах.

Аршанская і Мсьціслаўская партарганізацыі павінны неадкладна кінуць усе сілы на ліквідацыю недахопаў на фронце ўсеагульнага навучаньня, павінны забясьпечыць нармальную бесперабойную работу школ.

Ахапіць школамі сотні пакінутых за школай дзяцей праз адкліканьне настаўнікаў з пэдагагічнай работы, забясьпечыць школы кадрамі выкладчыкаў, паладзіць грамадзкае харчаваньне, забясьпечыць вучняў падручнікамі — неадкладная задача, якая стаіць перад усёй савецкай грамадзкасьцю ня толькі Аршанскага і Мсьціслаўскага раёнаў!

Партарганізацыі павінны дабіцца крутога пералому ў справе матар'яльнага забясьпечаньня настаўніцтва, ліквідаваць неданушчальныя выпадкі затрыманьня выплаты заработнай платы, прыцягнуць да суровай адказнасьці людзей, якія парушаюць і ігнаруюць пастановы ўраду і дырэктывы партыі.

Бліжэйшыя дні павінны забясьпечыць карэнны зрух у школьным будаўніцтве, у правядзеньні ўсеагульнага навучаньня. За арганізацыю гэтага пералому адказваюць перш за ўсё партыйныя ячэйкі, райкомы партыі і органы народнай асьветы.

На Аршаншчыне не выконваецца пастанова ЦК

Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе, ліквідацыі нпісьменнасьці, аб разгортваньні дашкольнага выхаваньня слаба рэалізуецца ў Аршанскім раёне.

Да гэтага часу ў раёне па-за школай затсаецца, па далёка нпоўных вестках, звыш 400 дзяцей рабочых, батракоў, калгасьнікаў і працоўнага сялянства. Саюз працасьветы літаральна ня прыняў ніякіх захадаў па выяўленьні настаўнікаў, якія або дызэртыравалі з пэдагагічнай работы або перацягнуты другімі арганізацыямі на работу, што ня зьвязана з пэдагагічнай дзейнасьцю.

31 пачатковая школа да апошніх дзён застаюцца без апалу. Яшчэ з вясны пачата будаўніцтва 12 школ. Да пачатку навучальнага году ні адна школа не пабудавана. Раённыя арганізацыі маркуюць 7 школ закончыць у канцы гэтага месяца. Даволі бегла азнаёмцца са становішчам будаўніцтва, каб пераканацца ў тым, што гэтае меркаваньне ні ў якім разе ня будзе выканана.

У значным ліку школ не праведзена н'якага рамонту і абсталяваньня. У гэтых школах пачаты заняткі па сутнасьці ў немагчымых умовах.

Каапэрацыйныя арганізацыі сабатуюць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб забясьпячэньні вучняў гарачымі сьнеданьнямі. Прыкладна толькі 25-28 проц. вучняў забясьпечаны гарадзкім харчаваньнем, прычым многія тысячы вучняў ня толькі ня маюць сьнеданьняў, але пазбаўлены права на атрыманьне цукру і гарбаты. Яшчэ горшае становішча з забясьпячэньнем вучняў абуткам і вопраткай. Толькі 7 проц. школьнікаў атрымалі абутак.

Некаторыя школы зусім ня маюць падручнікаў (Бабініцкая школа, школы Крапіўніцкага сельсавету і інш.), або ёсьць у колькасьці 4-5 штук на групу. Зусім адсутнічаюць прадметы наглядай агітацыі, геаграфічныя карты і т. д. Да гэтага часу ў раёне арганізавана ўсяго толькі 10 рабочых пакояў і 4 майстэрні, прычым пераважная большасьць іх зусім не абсталявана.

Работа па перазаключэньні сацдагавораў і прымацаваньне школ да прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў праходзіць вельмі марудна. Прынятыя па гэтым пытаньні пастановы раённымі арганізацыямі ня выкананы.

Ніякага зруху і палепшэньня няма ў справе матар'яльнага забясьпячэньня настаўніцтва. Значная частка настаўнікаў ня мае абутку і вопраткі ў сувязі з чым часта зрываюцца заняткі ў школах, а настаўнікі пазбаўлены магчымасьці прымаць удзел у грамадзкай рабоце. Дырэктыва СНК БССР аб арганізацыі ў Воршы закрытай сталоўкі для настаўніцтва Аршанскім гарсаветам ня выканана.

Мы-б маглі падаць шмат прыкладаў, калі паасобныя настаўнікі праводзяць выхаваньне вучняў у рамках старой схалястычнай школы, калі палітэхнізацыю падменьваюць падрыў тоўкай мала асьвечаных непрыстасаваных да запатрабаваньняў данага этапу сацыялістычнага будаўніцтва людзей. Зусім слаба пранізаны навучальныя праграмы мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, ён зусім не адчуваецца ў выкладаньні большасьці настаўнікаў, адсутнічае патрэбная ўвязка тэарытычнай вучобы з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва.

Апарат адзелу парасьветы выказвае сваю поўную няздольнасьць ажыцьцяўляць дырэктывы партыі па перабудове работы савецкай школы.

Такое становішча ў школьным будаўніцтве на Аршаншчыне перш за ўсё тлумачыцца тым, што партыйная арганізацыя не аддала належнай увагі пытаньню рэалізацыі пастановы ЦК аб пачатковай і сярэдняй школе.

Алі'евіч.

Бясплянавае кіраўніцтва Танескай МТС

СТАРОБІН. Асноўная частка калгасаў Старобіншчыны абслугоўваецца Танескаю МТС.

Паводле дагавору з калгасамі, Танесная машына-трактарная станцыя праводзіць збожжазагатоўкі па большасьці гаспадарак раёнаў. Аднак, МТС не спраўляюцца са сваімі абавязкамі. Пляны здачы збожжа дагэтуль адпачываюць у папках. На нарадзе старшынь калгасаў работнікі МТС абмежаваліся агульнай заявай аб неабходнасьці здаць збожжа, зачыталі «арыентыровачны» плян здачы з агаворкаю, што пічбы будуць яшчэ перагледжаны і пасланы калгасам.

Але пляны дагэтуль перагледжаюцца і не даведзены да калгасаў.

У выніку такога кіраўніцтва, некаторыя праўленьні калгасаў дакаціліся ад кулацкіх прынцыпаў разьмеркаваньня ўраджаю — у графе «здача збожжа дзяржаве» не фігуруе ніводнага кіпё (калгасы «Чырвоная зорка» і «Чырвоны хлебароб»). «Плянаў здачы няма, ня ведаем, чым кіравацца»,—тлумачаць яны.

Трэба пакончыць з бясплянавым кіраўніцтвам загатоўкамі з боку Танескай МТС, якое садзейнічае распаўсюджаньню кулацкіх, спажывецкіх тэндэнцый.

К.

Ні ў аднэй школе не арганізаваны гарачыя сьнеданьні

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Ад нашага спэцкора). Раённыя арганізацыі апрача агульных разважаньняў па рэалізацыі пастановы ЦК аб сярэдняй і пачатковай школе літаральна не прынялі ніякіх канкрэтных і практычных захадаў.

Ні адно школьнае памяшканьне да гэтага часу не пабудавана, ня гледзячы на тое, што плянам было прадугледжана пабудаваць 5 школьных будынкаў да пачатку навучальнага году. Для пасьляховага сканчэньня будаўніцтва былі ўсе неабходныя ўмовы. Своечасова былі дастаўлены лесаматар'ялы, была рабочая сіла і г. д. «Дробязь», з-за якое сарвана школьнае будаўніцтва, заключаецца ў тым, што РВК не фінансаваў будаўніцтва, ня гледзячы на прадугледжаныя кашторысам сродкі.

Раённыя арганізацыі, неданушчальна слаба змагаючыся за выкананьне зусім рэальнага фінпляну, тым самым ставяць пад пагрозу рэалізацыю пастановы ПК аб школе, ажыцьцяўленьне ўсеагульнага навучаньня і правядзеньне палітэхнізацыі.

У радзе школ яшчэ дагэтуль не распачаты заняткі часткова з-за адсутнасьці пастаўнікаў і ў асноўным у сувязі з тым, што школьныя будынкі не адрамантаваны і зьяўляюцца непрыгоднымі для правядзеньня нармальнай школьнай работы. Кулацкія дамы не перададзены школам і не прыстасаваны для заняткаў.

Пераважная большасьць школ не забясьпечана апалам, газай і падручнікамі.

Зараз літаральна нічога ня робіцца, каб у самы кароткі тэрмін правесьці рамонт, каб пачаць заняткі ва ўсіх без выключэньня школах.

У той час, як у БССР ёсьць многа раёнаў, у якіх 100 проц. вучняў забясьпечаны гарачымі сьнеданьнямі, абуткам, вопраткай, навучальнымі прыладамі.

У Мсьціслаўскім раёне **НІ Ў АДНЭЙ ШКОЛЕ НЕ НАЛАДЖАНЫ ГАРАЧЫЯ СЬНЕДАНЬНІ**, не забясьпечаны вучні вопраткай і абуткам.

Каапэрацыйныя арганізацыі ўпартаадмаўляюцца даць у гэтым напрамку школам патрэбную дапамогу і па сутнасьці гэтым самым сабатуюць выкананьне дырэктыў ураду аб забясьпячэньні школьнікаў гарачымі сьнеданьнямі і абуткам.

Зусім неданушчальнае становішча пагляддаецца ў справе матар'яльнага забясьпячэньня настаўнікаў. Настаўнікі як у горадзе, так і асабліва на вёсцы ня прыроўнены ў забясьпячэньні, па волле дырэктыў партыі і ўраду, да атаведных катэгорый рабочых. Праўленьні калгасаў адмаўляюцца выкананць дырэктыву ўраду аб забясьпячэньні настаўнікаў прадуктамі са сваіх уласных рэсурсаў. Матар'яльнае становішча настаўніцтва пагаршаецца яшчэ тым, што на працягу некалькіх месяцаў як вясковыя, так і гарадзкія настаўнікі не атрымліваюць зарплаты. Пагляда́юцца паасобныя выпадкі выкідваньня настаўнікаў з кватэр.

Паданыя факты сьведчаць аб тым, што ў раёне няма патрэбнага пералому пакат пасьля апублікаваньня пастановы ЦК аб школе, аб тым, што недаацэньваецца вялізарнае значэньне ўсеагульнага навучаньня.

Р.

Абязьлічанае і сельспажыўтаварыства

Калі спажывецкая каапэрацыя гораду зрабіла першыя крокі ў перабудове сваёй работы, дык гэтага нельга сказаць аб многіх раённых і сельскіх спажывецкіх таварыствах.

Да ліку таварыстваў, якія не зрабілі дзейсных крокаў у галіне перабудовы сваёй работы, належыць і Вобальскае сельскае спажыўтаварыства, Сіроцінскага раёну. Гэтае таварыства знаходзіцца ў цэнтры Вобальскага сельсавету пры станцыі Вобаль. Пад яго ведамам ёсьць загатоўчы пункт, які загатаўляе больш чым адну трэцюю частку прадукцыі раёну. Вобальскае сельспажыўтаварыства абслугоўвае шмат рабочых дарожнага і інш. будаўніцтва. Словам, т-ва мае вялікія магчымасьці для разгортваньня сваёй работы.

Ня гледзячы на гэта, пытаньне аб перабудове работы кіраўніцтвам таварыства яшчэ па-сур'ёзнаму ня ставіліся. У гэтым немалая віна мясцовай партарганізацыі і яшчэ большая—райспажыўсаюзу.

Сіроцінскі райспажыўсаюз абмежаваўся дасылкай інструкцыі аб тым, што сельспажыўтаварыства павінна перайсьці на гаспадарчы разрахунак. [illegible] «перабудова» і скончылася. [illegible]ыўсаюз нічога не прадпрыняў для ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку ў сельскіх спажыўтаварыствах. Сродкі ня вылучаны. Асобнага кантакарэнту ў райбанку няма. Вобальскае сельспажыўтаварыства знаходзіцца ў поўнай залежнасьці ад райспажыўсаюзу, яно ня мае ніякай самастойнасьці.

Кіраўніцтва гэтага таварыства не жадае праявіць сваёй ініцыятывы, нічога ня робіць, каб знайсьці дадатковыя таварныя рэсурсы, не разгортвае самазагатовак. Гэтай інэртнасьці спрыяе таксама і тое, што сельспажыўтаварыства ня мае сваіх сродкаў: яны абагулены і абязьлічаны ў райспажыўсаюзе.

Кіраўніцтва таварыства не праяўляе ніякай ініцыятывы. Яно сьлепа і безапэляцыйна мірыцца з цяперашнім становішчам.

Пастанова Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) работнікамі каапэрацыі не прапрацавана. Няма выразнага разуменьня сутнасьці савецкага гандлю, а таму нічога ня робіцца для палепшэньня спажэньня рабочых.

Да чаго абязьлічана сельспажыўтаварыства, відаць з таго, што яго кіраўнікі не займаюцца пытаньнем цэн на тавары, якія прадаюцца ў крамах гэтага-ж таварыства. Усё гэта робіцца ў райспажыўсаюзе, а сельскае т-ва зьяўляецца толькі сьлепым прадаўцом. Па запытаньне спажыўца, чаму мануфактура (маліскін — сукно) у якасьці прэміраваньня прадаецца па адной цане, а для прадаўнікоў дартрансу па другой, работнікі разводзяць рукамі. Яны ня ведаюць. Іх гэта, мабыць, ня цікавіць.

З-за непаваротлівасьці і раённага і сельскага спажыўтаварыстваў у якасьці асноўнага прамтавару для прэміраваньня здатчыкаў прадукцыі тэхкультур фігуруюць папіросы № 100, покалькі хусьцінак і ўсё.

Бескантрольна ідзе выдаткаваньне прамтавараў на прэміраваньне ўдарнікаў дарожнага будаўніцтва. Тут ва ўсю квітнее самаснабжэньне. Так, начальнік дарыстанцыі Фэль атрымлівае 15 мэтр. мануфактуры на 15 руб., гарнітур па 65 руб., рубаху па 9 руб. і інш., яго намесьнік Сташэвка, які да рэчы, не зьяўляецца найшчыкам каапэрацыі, атрымлівае адразу прамтавараў па 20 рублёў, старшыня сельсавету — па 11 руб. і г. д. у той-жа час сапраўдныя ўдарнікі і ўдарніцы дарожнага будаўніцтва Барбашоў, Бабаеў, Хамцоў, Лямпёва і інш. атрымалі па 4 мэтры мануфактуры коштам у два з паловай рублі.

Поўная перазьбярыха панае і ў адносінах аплаты працы работнікаў прылаўку, загатоўшчыкаў і членаў праўленьня. У мэтах укараненьня прэміяльна-зьдзельнай аплаты работнікаў райспажыўсаюз даслаў інструкцыю, якая ня была загадзя прапрацавана на праўленьні і папіраных парадах каапактыву.

Не зразумеўшы як сьлед прынцыпаў зьдзельшчыны, не жадаючы памазгаваць над тым, як устаноўкі новай інструкцыі ажыцьцявіць на ўмовах Вобальскага сельспажыўтаварыства, кіраўніцтва пры практычным ажыцьцяўленьні гэтай справы дапусьцілі блытаніну. Атрымалася так, што работніку прылаўку прыходзіцца 50 р. (замест ранейшых 100), а загатоўшчыкам ад 360 да 650 руб.

Замест таго, каб выправіць памылкі і растлумачыць работнікам прылаўку, **што павышэньне іх зарплаты залежыць ад іх саміх, г. з. ад таго, як яны возьмуцца за павялічэньне таваразвароту, за самазагатоўкі, замест гэтага праўленьне замяшалася.**

Такое «кіраўніцтва» спрыяла росту настрояў дэзэртырства сярод работнікаў прылаўку.

Характэрна, што такая блытаніна назіраецца ня толькі ў сельспажыўтаварыстве, але і ў райспажыўсаюзе. Малюнак, які прыводзіцца ніжэй, зьяўляецца пагляднай ілюстрацыяй таго, як у райспажыўсаюзе «распрацавалі» інструкцыі і як зразумелі прынцып зьдзельна-прэміяльнай аплаты.

У сіроцінскі райспажыўсаюз заходзіць старшыня Вобальскага сельспажыўтаварыства і заяўляе супрацоўнікам:

— Мы зарплату перавялі па процанты ад звароту.

О, добра, добра. Вы—першыя.

Тады старшыня сельспажыўтаварыства прызнаецца:

— А загатоўшчык-жа атрымае рублёў... 600 у месяц.

Тады не, ня добра — пачакайце.

Адзін супрацоўнік пытае другога, той ня ведае і бяжыць да старшыні райспажыўсаюзу Нікіфарава. Нікіфараў таксама ня ведае і бяжыць у раённыя кіруючыя арганізацыі з сэнсацыяй:

— Загатоўшчык атрымлівае ў месяц 600 руб.

У выніку ўстрымліваюцца ад процентаў, фактычна скасоўваецца зьдзельшчына, зарплата выдаецца па ранейшаму...

Аб чым усё гэта сьведчыць?

Па-першае, ясна, што інструкцыя складзена не прадумана, незразумела, на мясцох ня могуць у ёй як сьлед разабрацца. З-за адсутнасьці патрэбнага растлумачэньня інструкцыя внесла на мясцох блытаніну. Замест павялічэньня таваразвароту і разгортваньня савецкага гандлю атрымалася замяшаньне і рост дэмабілізацыйных настрояў сярод работнікаў. Гэта асабліва шкодна ў сучасны перыяд.

Па-другое, гэта сьведчыць аб тым, што з апарату нізавой каапэрацыі яшчэ ня вытручана косасьць, інэртнасьць, у выніку аматары «мэханічнага размеркаваньня тавараў» імкнуцца ўсімі сіламі перашкодзіць разгортваньню савецкага гандлю. Гэтыя факты таксама гавораць аб тым, што райпартарганізацыі, і ў даным выпадку Сіроцінскі РК КП(б)Б, не заняліся пытаньнем перабудовы работы спажывецкай каапэрацыі так, як гэтага патрабуюць дырэктывы Цэнтральнага Камітэту.

Неабходна прыняць рашучыя меры да перабудовы работы сельскай спажывецкай каапэрацыі. Патрэбна неадкладна пераверсьці сельспажыўтаварыствы на гаспадарчы разрахунак, вылучыць для іх самастойныя сродкі, прадаставіць поўную ініцыятыву. Белкаапсаюз, райспажыўсаюзы і мясцовыя партарганізацыі павінны не цыркулярамі і інструкцыямі, а справай дапамагчы сельскім спажыўтаварыствам увесьці гаспадарчы разрахунак, укараніць зьдзельна-прэміяльную аплату, растарнуць мясцовыя загатоўкі і дадатковае вышуканьне таварных рэсурсаў.

Толькі пры гэтых умовах можна дабіцца сапраўднага разгортваньня савецкага гандлю, павышэньня таваразвароту і палепшэньня рабочага спажэньня.

Мінуцкі.

АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ ШЭСЬЦЬ УМОЎ тав. СТАЛІНА НА ЛЕСАРАСПРАЦОЎКАХ

Леспрамгас павінен стаць сацыялістычным прадпрыемствам

Драўніна зьяўляецца важнейшым сырцом для прамысловасьці, каштоўным экспартным матар'ялам і разам з торфам складае асноўную крыніцу апалу для народнай гаспадаркі БССР.

Ад поўнага і своечасовага выкананьня плану загатовак, своечасовай вывазкі дроў і торфу залежыць пасьпяховае выкананьне ўсяго народнагаспадарчага плану чацьвертага рашаючага кварталу і пляну 1932 году.

Між тым, становішча з загатоўкамі дроў і лесу зусім нездавальняючае і патрабуе самага рашучага і неадкладнага павароту арганізацый тварам да гэтага адказьнейшага вучастку. Гэта задача становіцца яшчэ больш неадкладнай таму, што дровалесазагатоўкі адносяцца да сэзонных работ, яны павінны быць выкананы ў кароткі зімовы перыяд.

Некаторыя гаспадарчыя арганізацыі да гэтага часу яшчэ не ўсьвядомілі, што рашаючым зьвяном становіцца зараз леспрамгас, які зьяўляецца своеасаблівым прадпрыемствам і, як асноўная гаспадарчая адзінка патрабуе канкрэтнага кіраўніцтва па-новаму, паводле ўказаньняў тав. Сталіна.

Толькі няўхільнае выкананьне на ўсіх вучастках лясных работ шасьці ўмоў тав. Сталіна можа забясьпечыць перамогу.

Якія канкрэтныя задачы стаяць перад дровалесазагатоўчымі арганізацыямі?

Асноўнае мерапрыемства—гэта забясьпячэньне работ у лесе патрэбнай рабочай сілай.

Неразумоньнем шасьці ўмоў т. Сталіна было-б лічыць, быццам гэта задача зводзіцца толькі да «навербаваньня» патрэбнай колькасьці рабочых. З усёй рашучасьцю трэба падкрэсьліць, што адна толькі вярбоўка, на аснове фармальных дагавораў, ні ў якім разе не вырашае праблемы забясьпячэньня загатовак рабочай сілай. Гаспадарчыя арганізацыі павінны неадкладна ўзяцца за стварэньне палітычна адказнага вярбовачнага апарату, на якога, разам з органамі працы, ускладаецца арганізацыя набору і палітыка-выхаўчая работа сярод лесарубаў і возчыкаў. На жаль, да гэтага часу гаспадарчыя арганізацыі не надавалі належнай увагі пытаньням якасьці вярбоўкі і складу вярбоўшчыкаў.

Нашы арганізацыі да гэтага часу яшчэ не запаліся канкрэтнай работай па стварэньні такіх матар'яльных, культурна-бытавых умоў, якія-б забясьпечылі замацаваньне рабочай сілай на лесазагатоўках. Наркампрацы Белкаапсаюз, Калгаспэнтр, Наркамасьветы і Наркамаховы Здароўя амаль не прынялі ніякіх мер для палепшэньня бытавых умоў рабочых-лесарубаў.

Трэба памятаць, што новая абстаноўка, аб якой гаварыў тав. Сталін, адзначаецца тым, што селянін зараз ужо не ўцякае з вёскі, што матар'яльныя і культурныя патрэбнасьці калгасьніка значна вырасьлі.

Гаспадарчыя арганізацыі, Наркамасьветы і Наркамаховы Здароўя павінны паклапаціцца аб палепшэньні культурнага і мэдыка-санітарнага абслугоўваньня рабочых-лесарубаў. Трэба стварыць такія ўмовы, каб леспрамгас сапраўды стаў сацыялістычным прадпрыемствам.

Асноўнай задачай, якая павінна забясьпечыць выкананьне праграмы лесазагатовак, зьяўляецца павышэньне прадукцыйнасьці працы. Узьняцьце прадукцыйнасьці працы залежыць ад правільнай арганізацыі работы ва ўсіх «цэхах» дровалесазагатовак (вырубка, вывазка, апрацоўка), правільнай арганізацыі інструментальнай і рамонтнай справы, мэханізацыі працаёмкіх работ, ад правільнага выкарыстаньня ўсіх мэханізмаў, ад шырокага разгортваньня ўдарніцтва ў лесе.

Для ажыцьцяўленьня ўсіх гэтых задач неабходна перш за ўсё ліквідаваць абязьлічку ва ўсіх галінах загатоўчай работы. На жаль, да гэтага часу ў леспрамгасах, якія па сутнасьці зьяўляюцца адказьнейшымі і складанымі прадпрыемствамі, не праведзены элемэнтарныя патрабаваньні, без якіх немысьлімы сучасная сацыялістычная фабрыка або завод. Леспрамгас вельмі рэдка мае пэрфэкцыянаванае кіраўніцтва (дырэктарат, ТНВ, тэхнічнае кіраўніцтва і г. д.). Кіраўніцтва знаходзіцца не на месцы непасрэднай работы — у лесе, а часта вельмі далёка ад яго.

Неабходна ва ўсе элемэнты лясных работ унесьці «цэхавы» пачатак, правільна арганізаваць усю работу.

Выкананьне шасьці ўмоў тав. Сталіна на лесазагатоўках — вось мэта, якой павінны дабіцца гаспадарчыя арганізацыі і якая поўнасьцю забясьпечыць ажыцьцяўленьне плянаў загатовак і вывазкі.

Басін.

Ліквідаваць ураўнілаўку у расцэнках лясных работ

Наркампрацы БССР прынялі рад мер для забясьпячэньня выкананьня пастановы ЦК аб дровалесазагатоўках.

Яшчэ 2 з паловаю месяцы назад Наркампрацы, Беллеспрам і цэнтральнае праўленьне саюзу леспрабочых вызначылі групу работнікаў для пасылкі ў найбольш мэханізаваныя і лепшыя па арганізацыі працы леспрамгасы СССР.

Зараз-ка пасьля прыезду гэтыя работнікі накіраваны ў Гомель і ў Борысаў для стварэньня там паказальных вучасткаў па дровалесазагатоўках. Апрача гэтага Наркампрацы мабілізаваў 55 работнікаў са свайго апарату і апарату Беллеспраму, якія паспаны ў 12 найбольш буйных леспрамгасаў для вярбоўкі рабочай і гужавой сілы, для правядзеньня прагрэсыўнэ - прэміяльнэ зьдзельшчыны на лясных работах.

Наркампрацы СССР даў адпаводны дазвол на вярбоўку 4.000 фурманаў і 1.600 лесарубаў у прымежных з БССР абласьцях Украіны.

Усё-ж, ня гледзячы на ўсе гэтыя мерапрыемствы, вярбоўка рабочай сілы праходзіць нездавальняюча.

Тав. АСМАКОЎ — ударнік матарыст электравагонкі фанэрнага цэху Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату

Асабліва дрэнна з укамплектаваньнем лесазагатовак гужавым транспартам. Расцэнкі, якія існуюць для возчыкаў на лесазагатоўках, ня вышэй расцэнак сярэдняга лесарубы, і, зразумела, ня могуць стымуляваць вярбоўку гужавога транспарту, бо яны ня ўлічваюць амартызацыі каня і інвэнтару.

Гаспадарчыя арганізацыі, ня гледзячы на выразную дырэктыву ЦК, не клапоняцца аб арганізацыі кузьняў. Возчыкі—калгасьнікі і аднаасобнікі—ня могуць дастаць у рабкопах патрэбнай ім калёснай мазі, жалеза для калёс і г. д.

Прагрэсыўна-прэміяльная зьдзельшчына ня ўведзена нават ва ўласным транспарце Лесбелу.

У большасьці леспрамгасаў ня створаны неабходныя ўмовы, якія-б забясьпечылі павышэньне прадукцыйнасьці працы. Не наладжана эканоміка працы, няма намесьнікаў дырэктароў па ахове працы, вытворчыя нарады скліканьцца вельмі рэдка, рабочых прапаноў ніхто не зьбірае і не выкарыстоўвае, вельмі слаба разгортваецца сацспаборніцтва.

Тэхніка бясьпечнасьці—адзін з тых вучасткаў, на якія ніхто не зварачае ўвагі.

Рабочкомы ў большасьці леспрамгасаў ня прымаюць мер для забясьпячэньня лесарубаў літаратурай, газэтамі. Ёсьць леспрамгасы, дзе за ўвесь час работы ня было ні аднаго кіно-сэансу.

Лесазагатоўчыя арганізацыі павінны тэрмінова пераключыцца на выкананьне 6 умоў т. Сталіна, на ліквідацыю ўраўнілаўкі ў зарплаце, на палепшэньне бясьпечнасьці лесарубаў, на стварэньне неабходных культурна-бытавых умоў работы ў лесе.

6 вагонаў—замест 100

ЦК КП(б)Б і СНК БССР далі выразныя ўказаньні леспрамгасам, якія прымацаваны да Менску, аб узмацненьні адгрузкі дроў на працягу лістапада. Між тым, першая дэкада лістапада ніякага пералому ў забясьпячэньні Менску дрывамі не дала.

Кожны дзень у Менск павінна прыбываць ня менш 100 вагонаў дроў. Між тым 1 лістапада прыбыло толькі 72 вагоны, 2-га—ні аднаго, 4-га—28, 6-га—6 вагонаў, 8-га—6 вагонаў і г. д.

Галоўная прычына такога незадавальчальна-слабога падвозу дроў у Менск —спыненьне вывазу дроў з лесу да чыгуначных станцый. Лесазагатоўчыя арганізацыі, спажнічыся на санную дарогу, зусім спынілі работу па вывазцы.

Значна тармозіць завоз дроў у Менск несваячасовая падача вагонаў чыгункай. Так, па аднэй толькі Рудабельскай ветцы ляжыць каля 300 вагонаў дроў, якія ня вывозяцца з-за адсутнасьці паражняка. Каля 150 вагонаў ляжыць на станцыі Ціхоў.

Леспрамгасы, не чакаючы санной дарогі, павінны зараз-жа ўзмацніць падвоз дроў да чыгуначных станцый.

Залежы дроў на станцыях

ПЯТРЫКОЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). ЧЫГУНКА ТАРМОЗІЦЬ АДГРУЗКУ ДРОЎ ДЛЯ МЕНСКУ. І ЛІСТАПАДА ЛЕСПРАМГАС ЗАПАТРАВАВАЎ ПАД ПАГРУЗКУ ДРОЎ 35 ВАГОНАЎ НА СТАНЦЫЮ КАПЦЭВІЧЫ, 5—НА СТАНЦЫЮ СТАРУШКУ, 5—НА СТ. ПІЧ І 5—МУЛЯРАЎКА. ЧЫГУНКА ПАДАЛА ТОЛЬКІ 35 ВАГОНАЎ. НА СТАНЦЫЯХ ПЯТРЫКОЎСКАГА ЛЕСПРАМГАСУ ЛЯЖЫЦЬ 1940 РАЎМЭТРАЎ ДРОЎ, ЯКІЯ НЯ МОГУЦЬ БЫЦЬ ВЫВЕЗЕНЫ З-ЗА АДСУТНАСЬЦІ ВАГОНАЎ.

Не паслабляць барацьбы за спараную

Спараная язда — аснова аздараўленьня паравознага парку і адна з галоўных умоў, якая павінна забясьпечыць узьняцьце якасьці работы сацыялістычнага транспарту.

З моманту апублікаваньня загаду тав. Андрэева прайшло ўжо больш месяца. За гэты час, у параўнаньні з мінулымі месяцамі, ёсьць некаторы зрух у галіне ліквідацыі абязьлічкі паравознага парку. Але гэты зрух яшчэ не забясьпечвае пасьпяховага выкананьня плянаў асеньня - зімовых паравозак.

Па віцебскім дэпо за другую палову кастрычніка было 213 выпадкаў зрыву спаранай, па Жлобінскім раёне — 79 выпадкаў, па Аршанскім дэпо (за 25 дзён кастрычніка) толькі па пасажырскіх паравозах быў 41 выпадак зрыву спаранай.

Камісіяй па праверцы работы Аршанскага дэпо выяўлена, што паравозы 96—35, 98—74 доўгі час былі абязьлічанымі. Брыгады, прымацаваныя да паравоза № 96—35, зрабілі за кастрычнік толькі 2 паездкі на сваім паравозе, а брыгады паравоза № 98—74 — пяць паездак.

Па магілёўскім дэпо за другую палову кастрычніка было 22 выпадкі зрыву спаранай, а па асіпавіцкім дэпо — 23.

Прычына — няправільнае скарыстаньне паравозных брыгад і вялікая іх цякучасьць.

Барацьба з канкрэтнымі вінаватымі ў такой работе транспарту праводзіцца надзвычай слаба. Па віне прагульшчыка - камсамольца Дзюбіна (віцебскае дэпо) было абязьлічана 6 паравозаў, па віне прагульшчыкаў—памочнікаў машыністаў Чарнова, Луневіча, Будкевіча і іншых у адзін дзень былі абязьлічаны 24 паравозы.

Па віцебскім дэпо ўлік прымацаваных брыгад да паравозаў не наладжан. Па паравозе Щ - 202 лічыцца прымацаваным з 19 кастрычніка памочнік машыніста, а фактычна ён увесь час хворы. Тое самае па паравозах 60—25, 44—36, 706 і г. д.

Пры аналізе зрываў спаранай лішні раз пацьвярджаецца, што дэпо БССР маюць усе магчымасьці для поўнай ліквідацыі абязьлічкі паравознага парку. Трэба толькі па-бальшавіцку ажыцьцяўляць загад тав. Андрэева.

У загадзе тав. Андрэева вызначаны канкрэтныя шляхі ліквідацыі абязьлічкі паравознага парку. У прыватнасьці пасажырскія і таварныя паравозы павінны праводзіць сваю работу з 1 лістапада 1931 г. па цьвёрдых месячных графіках. Гэта мерапрыемства накіравана на павялічэньне карыснай работы паравоза ня менш як на адну гадзіну і замацаваньне спаранай язды. Аднак, гэты пункт загаду тав. Андрэева выконваецца не па ўсіх дэпо. Па аршанскім дэпо па графіку працуюць толькі пасажырскія паравозы, а для таварных графікі яшчэ «распрацоўваюцца»...

Сапраўднае прымацаваньне брыгад да паравозаў, рацыянальнае скарыстаньне гэтых брыгад, карэннае палепшэньне работы нарадчыкаў, дыспэтчарскага апарату, кантрольных пастоў і вугальных складаў—вось практычны шлях да ліквідацыі абязьлічкі паравознага парку.

Н. Г.

АКУПАНТЫ ЗАМАЦОЎВАЮЦЬ ЗАХВАЧАНЫЯ РАЁНЫ

ЛІГА НАЦЫЙ ГАТОВА НА УСЛУГІ...

Падрыхтоўка рэстаўрацыі манархіі ў Манчжурыі

МУКДЭН, 16. Старшыня праўленьня Паўднёва-Манчжурскай чыгункі Учыда, які знаходзіцца ў сучасны момант тут, заявіў: «Японія не дапусьціць рэстаўрацыі манархіі ў Манчжурыі». Аднак, паведамленьні, якія паступаюць кожны дзень, сьведчаць якраз аб адваротным-аб падрыхтоўцы рэстаўрацыі манчжурскай дынастыі. Некаторыя гаворыць нават, што рэстаўрацыя адбудзецца не пазьней, чым праз два тыдні. Некалькі магазынаў у Мукдэне вывесілі ўжо сьцягі з эмблемамі манчжурскай дынастыі.

Генэрал Ма абвяргае хлусьню

ШАНХАЙ, 16. Карэспандэнт «Івнінг пост» паведамляе, што генэрал Ма ў інтэрв'ю з ім адмаўляў атрыманьне калі-небудзь дапамогі з боку СССР, ці што ён зварачаўся калі-небудзь за дапамогай у СССР. Генэрал Ма адзначыў, што ён парашыў змагацца да канца. А калі ён вымушан будзе адступіць, ён пойдзе са сваімі войскамі ў вёску, адкуль будзе весьці барацьбу з японцамі мэтадамі грамадзянскай вайны.

Карэспандэнт «Івнінг пост», які наведаў Цыцыкарскі фронт, сьцьвярджае, што «няма ніякіх доказаў дапамогі, якая аказвалася саветамі генэралу, Ма». Можна заўважыць толькі нязначныя групы белагвардзейцаў, якія працуюць упачы ў Харбін. Генэрал Ма сказаў карэспандэнту, што японскія ультыматумы ён атрымлівае кожны дзень.

Японія ня хоча нават гаварыць аб эвакуацыі Манчжурыі

ТОКІО, 16. Кітайскай місіі пасланы адказ па ноту нанкінскага ўраду ад 4 лістапада, у якой нанкінскі ўрад, спасылаючыся на пастанову Лігі Нацый ад 24 кастрычніка, патрабаваў эвакуацыі японскіх войск з Манчжурыі. Адказ японскага ўраду абыходзіць моўчкі пастанову Лігі Нацый «

У адказе асаблівая ўвага аддаецца антыяпонскаму руху, які, паводле думкі японскага ўраду, быў выклікан «паўвіне і пры патураньні Нанкінскага ўраду». Пакуль кітайскі ўрад,—таворыцца ў адказе,—не адмовіцца ад антыяпонскага руху, як зброї нацыянальнай палітыкі і ня прызнае дагавору, **няма чаго ўступаць у перагаворы аб такіх дэталях, як эвакуацыя, перадача вызваленых тэрыторый і г. д.** (ТАСС).

Сын Макданальда аб становішчы ў Манчжурыі

ЛЁНДАН, 14. Малькольм Макданальд, сын прэм'ер-міністра, выступаючы ў Оксфордзкім унівэрсытэце і ў лейбарысцкім клюбе наконт становішча ў Манчжурыі заявіў, што калі палітыка Лігі Нацый пацерпіць няўдачу, дык можа разгарэцца «самая вялікая вайна», якая не абмяжуецца толькі тэрыторыяй Манчжурыі. Японія павінна будзе паслаць войска ў Кітай, каб выкараніць эканамічны байкот,—заявіў далей Малькольм Макданальд,—а Расія, Амэрыка, Англія і Францыя павінны будуць тады вызначыць свае пазыцыі.

Перад адкрыцьцём сэсіі рады Лігі Нацый

Закулісныя перагаворы імпэрыялістаў

ПАРЫЖ, 16. Агенцтва Гавас паведамляе: «Пачаліся прыватныя перагаворы паміж членамі рады Лігі Нацый наконт японска-кітайскага канфлікту. У сувязі з гэтым у колах рады Лігі Нацый сьцьвярджаюць, што хаця Даўэс (пасол ПАЗШ у Лёндане) ня мае намеру прымаць удзел у пасяджэньнях у рады Лігі Нацый, тым ня менш ён будзе прымаць актыўны ўдзел у яго работах».

***

ПАРЫЖ, 16. Уся прэса прысьвячае перадавыя артыкулы сэсіі рады Лігі Нацый, якая адкрываецца. Радыкальна-пацыфісцкая прэса настроена пэсымістычна, бо яна ня бачыць выхаду са створанага становішча.

Правая прэса па-ранейшаму выступае ў баявым тоне, **яўна падтрымліваючы Японію.** «Пці журналь» паказвае «на анархію і развал, якія пануюць у Кітаі і заяўляе, што кітайскі ў рад імкнецца зьнішчыць так званыя «пяроўныя дагаворы» з усімі дзяржавамі, а ня толькі з Японіяй.

«Экспэльсыёр» паказвае на важнасьць японскіх інтарэсаў у Манчжурыі і робіць вывад, што рада Лігі Нацый павінна дабіцца такога рашэньня, пры якім «Японія застанецца і ў далейшым фактарам парадку і роўнавагі на Далёкім Усходзе».

Усеагульная забастоўка трамвайшчыкаў у Варшаве

ФАШЫСЦКАЯ ПРЭСА ДАМАГАЕЦЦА СУРОВАЙ РАСПРАВЫ НАД РАБОЧЫМІ

ВАРШАВА, 17. Наперакор намаганьням сацыял-фашысцкіх прафсаюзаў, **у Варшаве зноў пачалася ўсеагульная забастоўка трамвайшчыкаў і рабочых гарадзкога аўтабуснага парку.** Пад націскам рабочых, якія патрабуюць павышэньня зарплаты на 5 проц., перагаворы згодніцкіх прафсаюзаў з магістратам былі сарваны і частка дэлегацый з пралетаўнікамі левай дэманстрацыйна выйшлі з пасяджэньня на вуліцу з пяяньнем рэвалюцыйных песень.

Ночу ў трамвайных майстэрнях адбыліся рабочыя мітынгі для абмеркаваньня становішча. На мітынгах раскідваліся камуністычныя адозвы, якія заклікалі да салідарнай барацьбы аж да пераможнага канца. У адозвах, між іншым, паказваецца, што трамвайшчыкі павінны дабіваць на ня арыштаванага ўладамі ў чэрвені месяцы забастовачнага камітэту трамвайшчыкаў.

Прадстаўнікі згодніцкіх прафсаюзаў прабавалі пераканаць рабочых прыняць уступкі магістрату і «часова» адмовіцца ад забастоўкі і чакаюць канчатковых разультатаў перагавораў. Усе гэтыя спробы пацярпелі, аднак, паражэньне. Баючыся ў другі раз застацца за бортам руху, асьвістаныя правадыры згодніцкіх прафсаюзаў пастанавілі ўступіць і нават зрабіць выгляд, што яны гатовы ўзяць у свае рукі кіраўніцтва забастоўкай. Адначасова яны згуртоўваюць свае намаганьні на тым, каб абмежаваць забастоўку «чыста эканамічнымі» патрабаваньнямі і не дапусьціць пашырэньня забастоўкі.

Газэты, якіх забастоўка захапіла нечакана, ня ўтойваюць сваёй трывогі, паказваючы, што арышт ранейшага забастовачнага камітэту і закрыцьцё левага прафсаюзу трамвайшчыкаў ня ўнесьлі ніякага «супакаеньня» ў рады трамвайшчыкаў. «Газэта Польска» заклікае да «спыненьня агіднасьцяй» і да «цьвёрдай» палітыкі.

Забастовачная хваля пашыраецца

ВАРШАВА, 17. Хваля забастовачнага руху ў Польшчы разрастаецца. **Выбухнула забастоўка на прадпрыемстве «Нафталін» у Катавіцах** (Верхняя Сілезія). **У Варшаве** забаставалі рабочыя, занятыя вырабам шавецкіх калодак. **У Лодзі** пасьля кароткага перапынку пачалася зноў забастоўка пекараў, прычым характэрна, што ў часе разгулу шырокага антысэміцкага руху бастуюць салідарна польскія і яўрэйскія пекары супроць аб'яднаных польска-яўрэйскіх прадпрыемцаў. Рабочыя-пекары патрабуюць захаваньня 8-мігадзіннага рабочага дня і ранейшай зарплаты.

ЗАТРУДНЕНЬНІ, ЯК.Х НІХТО З ЧЛЕНАЎ ПАЛАТЫ АБШЧЫН НЯ ПАМЯТАЕ

РЭЦЭПТ „ЛЯЧЭНЬНЯ“ КРЫЗІСУ АНГЕЛЬСКІМ УРАДАМ

ЛЁНДАН, 16. Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «Выступаючы ў палаце абшчын міністар гандлю Рэнсымэн (лібэрал) заявіў, што хоць выбары зьяўляюцца ўжо мінулым этапам, — крызіс яшчэ не пераможаны, і становішча застаецца абвостраным. Мы перажываем, — сказаў Рэнсымэн, — вялізарнейшыя затрудненьні і ўскладненьні, падобных якім ніхто з членаў палаты абшчын ня памятае. Высокія палаткі, праблема грашовага звароту, падзеі ў Манчжурыі, пытаньні аб рэпарацыях, фінансавае становішча Германіі, — усё гэта мае вельмі няжкія вынікі. Калі адпаведныя крокі ня будуць прыняты, дык бліжэйшы год будзе горшым годам для брытанскай прамысловасьці.

Рэнсымэн далей заявіў, што габінэт мае намер прыступіць да вырашэньня стаячых перад ім пытаньняў з вялікай шпаркасьцю. У адносінах накладаньня якіх-небудзь мыт, якія фактычна забараняюць ці абмяжоўваюць імпарт, Рэнсымэн заявіў: «Мы не павінны прадпрымаць нічога такога, што ўскладніла-б паступленьне плацяжоў з-за мяжы, і мы зрабілі-б неразумна, калі-б дакладна сьледавалі мытнай палітыцы ПАЗШ. Чакаючы ўвядзеньня мытаў, за апошні час адбываецца ўзмоцненны імпарт».

Рэнсымэн заявіў, што ўрад прыпоў да заключэньня, што лепшым мэтадам безадкладнага процідзеяньня ненармальнаму імпарту зьяўляецца прадастаўленьне міністэрству гандлю паўнамоцтваў даваць распараджэньні аб увядзеньні мытаў у разьмеры, які не перавышае 100 проц. кошту ўсіх тавараў, якія падпадуць пад дзеяньне будучага закону аб тарыфах. (Гучныя ўхваленьні на лаўках міністраў). С.-г. прадукты ня будуць падлягаць абкладаньню.

Рэнсымэн паказаў, што неабходныя фінансавыя рэзалюцыі будуць унесены заўтра-ж і што адпаведны законапраект будзе праведзены праз усе інстанцыі да 19-га лістапада і атрымае каралеўскую санкцыю 20-га лістапада. Гэта заява зноў выклікала воплескі на лаўках міністраў.

У клясыфікацыю тавараў, на якія будуць, згодна заявы Рэнсымэна, уведзены ўвозныя мыты, між іншым уваходзяць прадметы ганчарнай вытворчасьці, вырабы з жалеза, сталі і шкла, каляровыя мэталі і вырабы з іх, нажовы тавар, іншыя жалезныя і сталёвыя вырабы, з дрэва, учаючы мэблю, бавоўняная, баўняная і шаўковая пража, хэмічныя, аптычныя, фарбавальныя тавары, адейныя фарбы, нафта, тлушч, смала, скура і вырабы са скуры, папера, кардон, усякія сродкі транспарту, уключаючы параходы, параходы і аэрапланы, модныя тавары, футры, галянтарэя, ваналкі, музычныя інструманты, спартыўныя прылады і пацкі. Рэнсымэн заявіў таксама, што ў адносінах мерапрыемстваў супроць ненармальнага імпарту міністэрства гандлю просіць паўнамоцтваў на тэрмін у 6 месяцаў.

КАМПАРТЫЯ ПОЛЬШЧЫ ЗАКЛІКАЕ ПРАЦОЎНЫХ ДА БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ ЯПОНСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ ЗА АБАРОНУ СССР

Рабочыя, сяляне і салдаты!

Японскія імпэрыялісты ўварваліся ў Манчжурыю. Разгарэлася новая імпэрыялістычная вайна, якая можа пашырыцца, таксама як сэрбска-аўстрыйскі канфлікт у 1914 годзе—у сусьветную вайну.

Ужо доўгі час японская буржуазія шукалася да захвату Манчжурыі. Японская буржуазія пры гэтым галоўнай мэтай мела перш за ўсё тое, каб адсунуць СССР з паўночна-манчжурскай чыгункі, якая злучае Уладывасток з пэнтральнымі ваколіцамі пралетарскай дзяржавы. Японскі ўрад націскаў на запрадаванага сабе дыктатара паўночнага Кітаю, вядомага ката кітайскай рэвалюцыі, Чан-Сюэ-ляна, каб ён справакаваў антысавецкую вайну. У 1929 годзе Чан-Сюэ-ляп арыштаваў савецкае консульства ў Пекіне і разграміў савецкую адміністрацыю паўночна-манчжурскай чыгункі. Савецкая дзяржава пераможна адбіла правакацыю кітайскай контр-рэвалюцыі, якая перш за ўсё разьлічвала на дапамогу Амэрыкі. Мы памятаем тагачасную ганебную ролю II Інтэрнацыяналу.

Таварышы! Прыгледзьцеся, як трымалася ў сувязі з японскім нападам на Кітай імпэрыялістычная Ліга нацый. Апрача «пажаданьняў» да абодвых ваюючых бакоў, каб спынілі ваенныя дзеяньні, апрача нікчэмных пацыфістычных фраз—абсалютна нічога.

Адна адзіная дзяржава на сьвеце, якая публічна выступіла супроць імпэрыялістычнага японскага нападу, у абарону незалежнасьці Кітаю, гэта—пралетарская дзяржава, СССР. Адзіная сіла ўнутры Кітаю, якая можа абаронць незалежнасьць Кітаю, гэта—гераічная камуністычная партыя Кітаю, якая кіруе вялізнымі тэрыторыямі, што знаходзяцца пад уладай Саветаў.

Кожны рабочы і селянін павінен сабе ясна ўявіць, што японскі напад на Манчжурыю свім лёсам накіраван супроць СССР. Таксама, як у папярэднія гады, так і зараз японскія імпэрыялісты імкнуцца захваціць К.-Ўсх. чыгунку, а таксама ўмацавацца на савецкім узьбярэжжы Піхага акіяну.

Кожны рабочы і селянін павінен таму ўважліва сачыць за разьвіцьцём падзей. Імпэрыялісты і іх вартавая сабака на заходніх савецкіх межах—фашысцкі ўрад Пілсудскага, захоча выкарыстаць японска-кітайскую вайну для рэалізацыі сваіх антысавецкіх інтэрэсыцішных плянаў!

Камуністычная партыя Польшчы заклікае вас да сходаў, дэманстрацый, палітычных забастовак!

Супроць імпэрыялістычнай вайны!

Супроць нападу японскага імпэрыялізму на Кітай!

Супроць імпэрыялістычнай Лігі нацый!

На абарону кітайскай рэвалюцыі!

Супроць падрыхтаваньняў польскага фашызму да антысавецкай вайны!

На абарону СССР!

Салдаты, маракі! Калі польскі фашызм адважыцца справакаваць вайну супроць савецкіх рэспублік, тады накіруйце сваю зброю супроць сваіх афіцэраў, генэралаў, супроць капіталістычнага панаваньня, тады разам з усім працоўным народам ператварыце імпэрыялістычную вайну ў барацьбу за пралетарскую дыктатуру, за рабоча-селянскі ўрад!

Цэнтр. Кам. Камун. партыі Польшчы.

ПА СССР І БССР

Абмеркаваньне праекту Вялікай Волгі

МАСКВА, 15 лістапада. На днях на пашыранай нарадзе ў Дзяржпляне СССР па разглядзе праекту Вялікай Волгі быў заслухан даклад прафэсара **Чаплыгіна.**

Кіруючая ідэя рэканструкцыі Волскай народнай гаспадаркі заключаецца ў тым, што асноўныя гідратэхнічныя пабудовы на Волзе павінны адначасова вырашыць **транспартныя, энэргетычныя і ірыгацыйныя** задачы і тым даць найбольшы гаспадарчы эфэкт. Тэхнічную рэканструкцыю Волгі, паводле праекту, які распрацоўваецца, намячаецца ажыцьцявіць шляхам рэгуляваньня стоку яе вод плацінамі, вышынёй напору, выстарчальнай для гідратэхнічнага скарыстаньня. Сыстэма такіх высокапанорных плацін вырашыць пытаньні і Волскай энэргетыкі, і водная транспарту.

Паводле першага варыянту праекту, вышэй Сталінграда, на Волзе намячаецца пабудова плаціны вышынёю ў 20 мэтраў з гідраўстаноўкай, магутнасьцю каля паўтара мільёны кілёват, з гадавой энэргіяй у 9 мільярдаў кілёват-гадзін. У паўночнай частцы лукі (і згіб ракі Волгі) праектуецца будаўніцтва плаціны вышынёй 20 мэтраў з каналам, які заканчваецца шлюзамі і гідраўстаноўкай. Агульная магутнасьць меркаванай гідрастанцыі вылічаецца ў 1.200 тысяч кілёват з задачай энэргіі ў 7 мільярдаў кілёват-гадзін. Падбор вады, дзякуючы ўстанаўленьню плаціны распаўсюдзіцца да Чэбаксар па Волзе і Чыстопаля па Каме. У гэтым раёне намячаецца пабудова яшчэ двух плацін са шлюзамі і цэлым радам гідраўстановак.

Агульная магутнасьць гідрастанцыі паводле схэмы Вялікай Волгі складае каля 8.800 тысяч кілёват. Гадавая ад дача гідраэнэргіі гэтай вялізарнай па магутнасьці станцыі дасягне 22 мільярдаў кілёват-гадзін. У глыбокаводную рачную сетку паводле варыянту Вялікай Волгі мяркуецца ўключыць ня толькі 4 тысячы кілёмэтраў асноўнага волска-камскага шляху, але і 6 тысяч кілёмэтраў яго прытокаў. У раёне гідраўстаноўкі—Самарскай луцкі, мяркуецца арганізацыя буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў—асноўных спажыўцоў гідраэнэргіі. У гэтым раёне намячаецца будаўніцтва прадпрыемстваў калёровых мэталяў, фэрасплаваў, хэмічнай і мэталяапрацоўчай прамысловасьці. Побач з гэтым, намячаецца арганізацыя вырабу будматар'ялаў на будаўніцтва мукамольных і мясных камбінатаў, на пабудову сланцавых заводаў, а таксама арганізацыя вырабу сынтэтычнага каўчуку і т. д.

Волскі водны шлях, Ніжні-Ноўгарад, Сталінград, а таксама чыгуначныя магістралі, што перасякаюць Самара-Сызранскі раён, зьвяжуць волскія прамкамбінаты са спажыўцамі яго прадукцыі—Маскоўскай вобласьцю, Сібірам і Сярэдняй Азіяй. Вырашэньне праблемы Вялікай Волгі дасьць магчымасьць абвадзіць землі Заволжжа ў межах Самарскай паралелі на поўначы і да Волга-Ахтубінскай поймы на поўдні. Абвадненьне гэтага раёну зьявіцца асноўным вагаром, які адначасова з сацыялістычнай перабудовай гаспадаркі і мэханізацыяй сельска-гаспадарчых працэсаў і ўдасканаленьнем агратэхнікі дазволіць перавесьці сельскую гаспадарку Заволжжа і паўднёвага праваўзьбярэжжа на высокую вытворчую ступень.

Малочна-гародныя гаспадаркі, якія праектуюцца, павінны будуць забясьпечыць сваёй прадукцыяй Самару, Саратаў, Пакроўск, Сталінград і цэлы рад новых прамысловых цэнтраў. Народна-гаспадарчае значэньне глыбокаводнага Волскага і Камскага шляху значна павялічыцца пры злучэньні яго шляхам глыбокаводных каналаў з паўночным і паўднёвым морамі і прамысловымі цэнтрамі Саюзу і з Сібірскімі воднымі шляхамі. Праблема Вялікай Волгі павінна быць прадметам найсур'ёзнейшага падрабязнага вывучэньня ў мэтах устанаўленьня агульнай схэмы і вырашэньня яе, а таксама аб'ектаў першачарговага будаўніцтва.

Нарада заслухала рад асноўных праектаў па вырашэньні праблемы Вялікай Волгі. Выступіўшы ў спрэчках інжынэр Нікольскі прапанаваў увазе нарады сваю схэму Вялікай Волгі. Да вырашэньня праблемы Вялікай Волгі ён прабаваў падыйсьці шляхам выбару адноўкавых падпораў для таго, каб не стварацъ вялікіх разнабояў у канструкцыі станцый і, галоўным чынам, абсталяваньня іх. Паводле праекту Нікольскага, прапануецца пабудова станцыі каля Рыбінску магутнасьцю ў 100.000 кілёват і каля Ніжняга Ноўгараду ўстаноўка плаціны і станцыі ў 500.000 кілёват. Асноўнай задачай праекту інжынэра Нікольскага, такім чынам, зьяўляецца вырашэньне праблемы не Вялікай Волгі, а Волга-Касьпія.

Нарада стварыла спэцыяльную камісію па выпрацоўцы раду мерапрыемстваў і па вырашэньні праблемы Вялікай Волгі.

Вечар паказаў дасягненьняў савецкага кіно і радыё-тэхнікі

МАСКВА, 17. 16-га лістапада ў кіно-тэатры «Союзкино» адбыўся вечар паказаў дасягненьняў савецкага кіно і радыё-тэхнікі. Радыё-тэхніка ў сучасны момант дасягнула надзвычай высокага ўзроўню. Гукавая кіно-апаратура, якая вырабляецца на савецкіх заводах, дае выключна чысты гук. Былі паказаны адрыўкі гукавых кінокарцін «Златыя горы», «Шторм», прамова аб Леніне, сказаная буйнейшым англельскім пісьменьнікам Шоў ў часе яго прабываньня ў СССР і г. д. Вялікую зацікаўленасьць выклікала дэманстрацыя радыё-грамафона, які дае ясны гук. У 1932 г. пастаноўлена выпусьціць некалькі тысяч такіх радыё-грамафонаў. Пасьля былі прадэманстраваны савецкія грамплясьцінкі. Савецкія канструктары дабіліся таго, што замест звычайнага троххвілінага запісу на грамплясьцінцы можна «запісаць» 15-цігвілінную гутарку. Вялізарнае значэньне такія грамплясьцінкі могуць адыграць для «озвучания» кіно (злучэньне кіно з новым грамафонам). Быў таксама паказан апарат для перадачы рухомых малюнкаў у паветры («теловидение»). У сучасны момант у Маскве працуе эксперымэнтальная ўстаноўка савецкай канструкцыі. Вопытныя перадачы даюць вельмі добры рэзультат.

У камісіі выкананьня пры СНК БССР

Камісія выкананьня пры СНК БССР заслухала паведамленьні Наркамспабу, ВСНГ, Наркампрацы і БелМБІТ аб выкананьні пастановы ЦВК, СНК СССР, ЦКК-НК РСІ і ЦСПСБ наконт паляншэньня матар'яльна-бытавых умоў інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

Камісія выкананьня канстатавала, што, апрача Наркампрацы, адпаведныя арганізацыі не прынялі належных мер да сапраўднага ажыцьцяўленьня дырэктыў ўраду.

Наркамснабу, ВСНГ, Белгандлю і Белжылсаюзу даручана безадкладна вылучыць асоб, якія-б адказвалі за правядзеньне мерапрыемстваў па паляншэньні матар'яльна-бытавых умоў інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

Камісія выкананьня папярэдзіла кіраўнікоў народных камісарыятаў і гаспадарчых устаноў, старшынь Менскага, Віцебскага і Гомельскага гарсаветаў, старшынь РВК, а таксама вылучаных адказных асоб, што калі на працягу 15 дзён ня будуць прыняты рэальныя захады да паляншэньня матар'яльна-бытавых умоў ІТР, вінаватыя ў зрыве дырэктыў ураду будуць прыцягнуты да самай суровай адказнасьці.

НК РСІ даручана на працягу дэкады праверыць выкананьне паказанай пастановы НКСнабам, ВСНГ, Белгандлем і Белжылсаюзам.

Назначэньне т. Вальфсона С. Я. старшынёй дзяржаўнага вучонага савету БССР

Пастановай ЦВК БССР тав. **Вальфсон С. Я.** назначан намесьнікам народнага камісара асьветы і калегіяй НКА прызначан **старшынёй дзяржаўнага вучонага савету БССР.**

Пачынаючы з 1921 г. і да сучаснага моманту тав. Вальфсон зьяўляецца прафэсарам Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту па катэдры дыялектычнага матар'ялізму. З 1922 г., да назначэньня старшынёй дзяржаўнага вучонага савету, працаваў старшынёй цэнтральнага бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў.

Тав. Вальфсон зьяўляецца акадэмікам Беларускай Акадэміі Навук. Узнагароджан ордэнам чырвонага працоўнага сьцягу за выдатную і самаадданую работу на фронце культурнага будаўніцтва БССР.

НАЗНАЧЭНЬНЕ тав. ІНГУЛАВА

МАСКВА. Саюзны СНК назначыў тав. Інгулава членам калегіі Наркамснабу СССР.

Указаньне тав. Сталіна будзе выканана

у 1932 г. стварэецца 1.000 новых МТС

МАСКВА, 17. **У лісьце да ўсіх МТС тав. Сталін** паставіў задачай Трактарацэнтру стварыць у 1932 годзе 1.000 новых машына-трактарных станцый. Указаньне тав. Сталіна будзе поўнасьцю ажыцьцёўлена.

Выканаўчы заданьне партыі і ўраду аб давядзеньні ліку МТС у 1931 г. да 1.400, Трактарацэнтр прыступіў да новага будаўніцтва. Да вясны будучага году лік станцый у Саюзе перавысіць **2.000.** Пабудавана 776 новых МТС, з якіх 46 станцый ужо поўнасьцю ўкамплектаваны трактарамі. Палова новых станцый разгортваецца ў збожжавых раёнах, іншыя ў раёнах тэхнічных культур (буракоў, бавоўны, ільну, махоркі і г. д.). 200 МТС будуць абсталяваны магутнымі майстэрнямі капітальнага рамонту. Да восені 1932 г. будзе скончана будаўніцтва 1,000 новых станцый. Такім чынам да гэтага часу на калгасных палёх будзе працаваць 2.400 МТС. Магутнасьць трактарнага парку МТС у чэрвені бягучага году складала 680.000 конскіх сіл. Да вясны будучага году па станцыях будзе працаваць каля 100 тысяч трактараў, магутнасьцю амаль у 1.000.000 конскіх сіл. Трактарны парк усіх новых станцый камплектуецца выключна **машынамі савецкай вытворчасьці.** Рабочая кляса і калгаснае сялянства Савецкага Саюзу пачалі барацьбу за сталінскую тысячу новых МТС.

Спажывецкая КААПЭРАЦЫЯ БССР перавыканала плян адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам

Рапарт ЦК КП(б)Б і СНК БССР

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і мясцовых партыйных арганізацый сыстэма спажывецкай каапэрацыі БССР выканала ўскладзеную на яе партыяй і ўрадам адну з важнейшых задач—забесьпячэньне пралетарскіх цэнтраў СССР бульбай.

Павялічаны плян адгрузкі ў колькасьці 93.194 тоны спажыўкаапэрацыя перавыканала (адгружана 93.671 тона, або 100,5 проц.). Зараз працягваем далейшую неаслабную работу па ажыцьцяўленьні гадавога пляну за бесьпячэньня бульбай і іншай гародніной гарадоў БССР.

Прэзыдыум Белкаапсаюзу пераключае зараз усю сыстэму спажыўкаапэрацыі на пасьпяховае правядзеньне важнейшай гаспадарча - палітычнай кампаніі — загатовак збожжа, ільнавалакна і мяса,—і абавязвае ўсе зьвеньні спажыўкаапэрацыі разгарнуць сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы з тым, каб ва ўстаноўленыя партыяй і ўрадам тэрміны пляны загатовак збожжа, ільнавалакна і мяса былі безагаворачна выкананы.

Прэзыдыум Белкаапсаюзу ад імя ўсёй сыстэмы спажыўкаапэрацыі запэўняе ЦК КП(б)Б і СНК БССР, што ўскладзеныя на яе задачы, пры тай вялізарнейшай увазе, якая аказваецца рабоце спажыўкаапэрацыі з боку партыі, ураду, друку—асабліва газэты «Рабочий»—будуць выкананы. Усякія апартуністычныя разважаньні аб «нерэальнасьці» плянаў, месьніцка-спарэальнасьці, самацёк будуць жывецкія тэндэнцыі, самацёк будуць і ў далейшым сустракаць руйнуючы адпор.

Прэзыдыум Белкаапсаюзу.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— **ПК ЦКК КП(б)Б** паведамляе, што ў г. Менску з 22 лістапада пачынае працаваць выязная камісія ЦКК УсеКП(б) па разгляду апэляцый на рашэньні ЦКК КП(б)Б. Парадак разгляду апэляцый наступны: **22 лістапада** выклікаюцца наступныя т. т.: Заранкін Я. Я.—Мацілеў, Макарэвіч Д. Я., Чуланскі А. Д., Куэьмянкоў Н. І., Лейкін З. Ю., Хайкін А. Д. — Гомель, Мілеўскі Я. А. — Жлобін, Галоўкер А. А. — Бабруйск, Красноў П. М., Герцкін А. І., Фарбман Я. С., Якушэнка К. М. — Віцебск, Ермалюгін Я. І., Лебедзеў Я. Е., Фралкоў Б. Ул., Варшчаўскі Я. І. — Ворша, Жэўняк Р. А. — Чэрвень, Русовіч І. І., Эльянаў С. О., Табачнікаў Я. Я., Левін С. Е., Палуянчык А. А., Рабцэвіч Н. Я. —Менск. **23 лістапада** выклікаюцца наступныя т. т.: Пушчын К. Ф., Волгіна М. І., Несьцяронак А. К., Дземчанка І. Г. —Полацак, Сянкевіч П. І., Леган С. С. —Гарадокскі р., Пятрушка Ф. А., Лянда А. Б. — Мазыр, Міхаленка Р. М., Шаўцоў В. Н. — Карманскі р., Грыбоўскі П. Х. — Рагачоў, Сярдзюкоў Н. Н. — Крычаў, Кротаў А. Н.—Журавіны, Агульнік Я. Л. Эпеляў Л. М. — Слупак, Кавалёў П. І. — Клімавічы, Шабека І. М. — ст. Ворша. Яўка выкліканых т. т. абавязкова. Праезд за свой кошт.

Усім райкомам КП(б)Б, загадчыкам Культпропу РК.

Культпроп ЦК КП(б)Б прапануе ў лістападзе ў апошніх 2-х дэкадах распра цаваць у масавай сетцы партасьветы наступныя тэмы: 1. Аб ходзе загатовак, 2. Народна-гаспадарчы плян IV кварталу, 3. Перанывары прафорганаў і паварот прафсаюзаў тварам да вытворчасьці (увязваецца з гутаркай праграмы § 11). 4. Перавыбары парторганаў, 5. Аб становішчы і задачах чыгуначнага транспарту, 6. Пытаньні савецкага гандлю спарту, 6. Пытаньні савецкага гандлю (увязваецца з гутаркай § 12). Мэтад распрацоўкі па ўсіх гэтых пытаньнях дасылаем. У ВСПШ вышэйшых вывеньнях партасьветы абавязкова прапрацуй выдзеліўшы дадатковыя гадзіны для гэтых тэм

Заг. Культпропам ЦК КП(б)Б Чэрнушэвіч.

— **Дом Камасьветы.** 18/XI ад 7 да 9 гада.—індывідуальная кансультацыя па дыялектмату і гістмату.

—**Менгарком КП(б)Б і Райкапгасаюз** 22 лістапада г. т., у 10 гадз. раніцы (у клюбе Менгарсавету) склікаюць канфэрэнцыю калгасьніц, аднаасобніц—бядняцкіх і сераднячак Менскага раёну. Усім сакратаром сельпарткомаў, старшыням сельсаветаў і калгасаў забясьпечыць сваячасовую яўку дэлегатак на канфэрэнцыю.

— 19/XI, у 7 г. веч., у памяшканьні Культпропу ЦК КП(б)Б, пакой № 14, склікаецца **нарада т. т. выпускных у пэнтарскую групу Культпропу ЦК.** На нараду павінны зьявіцца наступныя т. т.: 1. **Эканамісты** — Лур'е, Ноткін, Бондар, Слоцін, Окур, Аксельрод, Айзенберг, Лойка і Тамашэвіч. 2. **Дыяматычкі і пеніністы:** Крывіцкі, Сасвіч, Сянкевіч, Мельцар, Выдра, Левін, Краўчук, Валабрынскі, Шамавалаў і Суворай. 3. **Гісторыкі:** Агульнік, Поташ, Югаў, Данільчык, Рыўгін, Горын, Пчарбакоў, Майсель, Радэцкі, Ошараў, Дулкаў, Застэнкер, Зюзькоў, Руды і Ляўкова. Яўка памянёных т. т. абавязкова і без спазьненьня.

Чырв. Зорка Пач. 6, 8-20.10-30 — Гаваращы гукавы фільм **ЗЛАТЫЯ ГОРЫ**

„КУЛЬТУРА“ Пач. 7, 8-45, 10-30 — 1) **Вялікая бяда Непаяной жанчыны** 2) **Электрагавор** культурфільм

ПРАЛЕТАРЫ — **Бэстэр Кітон АПАШТАНЫ** у фільме у 6 ч. Звыш праграмы **БАЛХАШ** у 2 ч.

„Юны Піянэр“ (будынак кіно „Культура“) — Арыгінальная камэдыя **„Два друга, модель и подруга“** Звыш праграмы—хроніка Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. дня.

„СПАРТАК“ Касы адкрыты з5г. — Выдатны фільм **ЧАЛАВЕК З ЛЕСУ** Драма ў 7 частках

Наркамсаем БССР і Белсаюзпушніна даводзяць да ведома ўсіх палаўнічых, што **20 лістапада 1931 г. дазваляецца абстрал белкі** на ўсіх рэчках БССР. **Наркамзем і Белсаюзпушніна**

З 1 сьнежня 1931 г., пры станцыі Менск адкрываюцца 2-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы сратавіцеляў, оцэпшчыкаў і стрэлачнікаў.

Жадаючыя паступіць на гэты **КУРСЫ** могуць падаць заявы ў кадраў начальніка станцыі Менск СЗ па працы тав. АЛЬХАВІКУ.

Пры падачы заяў неабходна мець пры сябе пасьведчаньне або даведку ад сельсавету, калгасу ці саўгасу. Скончыўшы гэтыя курсы маюць праза заняць пасаду сратавіцеля з акладам 110 р. 15 к., оцэпшчыка—85 р. 83 к. і стрэлачніка з акладам 66 р. 40 к. Забесьпячэньне прадуктамі па лініі ТСТ, таксама праводзіцца водпуск дроў па цьвёрдых цэнах і выдача разавых білетаў па норме.

СЗ па працы **АЛЬХАВІК.**

БЕЛАРУСКАЕ АДЗЯЛЕНЬНЕ „ТОРГСИН“ да скончаньня рамонту ўнівэрмага і галоўнай базы **АДКРЫВАЕ** 18 лістапада г. г. **часовую базу** ПА ВУЛ. ЛЕНІНА № 14, дзе будзе праводзіцца выдача і продаж ТАВАРАПРАДУКТАЎ УСІМ ГРАМАДЗЯНАМ, якія атрымліваюць вераводы 8-ае мяжы.

Кантора «ТОРГСИН» вымушаецца: вул. Энгельса № 8, тэл. № 12—17.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Сёньня і штодзённа працуе з 12 гадз. дня

НА ЭКРАНЕ МАСТАЦКАЯ КІНО-П'ЕСА з жыцьця кіно-акторaў, вытворчасьці Союзкіно **СУСЬВЕТНАЕ ІМЯ**

Рэжысэр **И. Вярхоўсні**

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ **кіно-нарыс № 59** вытворчасьці САЮЗКІНО

Пачатак сэансаў у 2 гадз., 3-30, 6, 7-30, 9, і 10-30. На дзённыя сэансы **цэны зьніжаны.**

Сёньня, 18-га лістапада, у 8 г. веч. у мод. інстытуце, у пэтаўлёга-анатамічнай аўдыторыі **адбудзецца ДЫСПУТ** на тэму: **„Што такое хвароба“.** Дакладчык праф. ХАЛАТАЎ С. М. Запрашаюцца навуковыя працаўнікі, дактары і студэнты. Месцам мод. інстытуту.

ТВМДБ 19 лістапада, у 7 гадз. веч., у Доме Камасьветы адбудзецца працяг абгаварэньня філёзоўскіх твораў т. Вальфсона С. Я. Запрашаюцца: партыйны і рабочы актыў і навуковыя працаўнікі. ТВМДБ.

ЗАГАД Асобнай Роце Сувязі Н-й Стралковай Беларускай Чырвонаштандартнай Дывізіі імя Фрунзе. 16-га лістапада 1931 г. гор. Менск. № 249.

Усяму пераменнаму сярэднему, малодшаму камсаставу, а таксама чырвонаармейскаму складу прызыву 1927, 1928, 1929, 1930